Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 59 (5733) | 12 сакавіка 1937 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

ПАДРЫХТОЎКА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР ПА НОВАЙ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЕ І АДПАВЕДНАЯ ПЕРАБУДОВА ПАРТЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ

Даклад тав. А. А. ЖДАНАВА на Пленуме ЦК ВКП(б) 26 лютага 1937 года

ПАВАРОТ У ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ КРАІНЫ І НАШЫ ЗАДАЧЫ

Таварышы, у сувязі з прыняццем новай Канстытуцыі Саюза ССР, нам прадстаяць выбары ў Вярхоўны Совет СССР і ў советы дэпутатаў працоўных зверху данізу па новай выбарчай сістэме. Перад нашай партыяй высоўваецца задача падрыхтоўкі да выбараў.

Характар гэтай падрыхтоўкі, яе зб'ём, маштаб і звязаная з ёй перабудова партыйнай работы вызначаюцца глыбінёй тых пераўтварэнняў, якія выцякаюць з новай Канстытуцыі для палітычнага жыцця нашай краіны.

Увядзенне новай Канстытуцыі азначае паварот у палітычным жыцці краіны. Сутнасць гэтага павароту заключаецца ў далейшай дэмакратызацыі выбарчай сістэмы ў сэнсе замены не зусім роўных выбараў у советы — роўнымі, многаступенных — прамымі, адкрытых — закрытымі.

Увядзенне новай Канстытуцыі адкідае ўсякія абмежаванні, існаваўшыя да гэтага часу да так званых ліпэнцаў.

Калі раней, да ўвядзення новай Канстытуцыі, выбары ў советы былі не роўнымі, то цяпер неабходнасць абмежавання роўнасці выбараў адпала, і ўсе грамадзяне маюць права прымаць удзел у выбарах на роўных падставах.

Калі раней выбары сярэдніх і вышэйшых органаў улады былі многаступеннымі, то цяпер, згодна новай Канстытуцыі, выбары ва ўсе советы будуць рабіцца ўсімі грамадзянамі непасрэдна шляхам прамых выбараў.

Калі раней, па старой Канстытуцыі, галасаванне пры выбарах было адкрытым і па спісах, то цяпер, згодна новай Канстытуцыі, галасаванне пры выбарах будзе тайным і па асобных кандыдатурах, высоўваемых па выбарчых акругах.

Нарэшце, Канстытуцыяй уводзіцца ўсенароднае апытанне, так званы рэферэндум.

Што азначаюць гэтыя змены ў выбарчай сістэме?

Яны азначаюць узмацненне кантролю мас у адносінах совецкіх органаў і ўзмацненне адказнасці совецкіх органаў у адносінах мас. Новая выбарчая сістэма ўмацуе сувязь народных абраннікаў з масамі выбаршчыкаў. Яна ласкі магутны штуршок да паляпшэння работы совецкіх органаў, да ліквідацыі бюракратычных перагібаў і скажэнняў у рабоце нашых совецкіх арганізацый, а гэтыя недахопы, як вы ведаеце, вельмі істотны.

Вынікам увядзення ўсеагульнага прамога і роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні будзе далейшае ўзмацненне палітычнай актыўнасці мас, упягненне новых пластоў працоўных у работу па кіраванню дзяржавай.

Тым самым дыктатура пролетарыята становіцца больш гібкай і, стала быць, больш магутнай сістэмай дзяржаўнага кіраўніцтва рабочага класа грамадствам, база пролетарскай дыктатуры расшыраецца, яе аснова становіцца больш моцнай.

Ленінізм вучыць.

«Дыктатура пролетарыята мае свае перыяды, свае асобыя формы, рознастайныя метады работы. У перыяд грамадзянскай вайны асабліва б'е ў вочы гвалтоўны бок дыктатуры... У перыяд будаўніцтва соцыялізма, наадварот, асабліва б'е ў вочы мірная, арганізатарская, культурная работа дыктатуры, рэволюцыйная законнасць і т. д. Але з гэтага зноў-такі зусім не выцякае, што гвалтоўны бок дыктатуры адпаў ці можа адпасці ў перыяд будаўніцтва. Органы падаўлення, армія і іншыя арганізацыі, неабходны цяпер, у момант будаўніцтва, таксама, як у перыяд грамадзянскай вайны. Без наяўнасці гэтых органаў немагчыма колькі-небудзь забяспечаная будаўнічая работа дыктатуры. Не трэба забываць, што рэволюцыя перамагла пакуль што ўсяго толькі ў адной краіне. Не трэба забываць, што пакуль ёсць капіталістычнае акружэнне, будзе і небяспека інтэрвенцыі з усімі выцякаючымі з гэтай небяспекі вынікамі».

(Сталін, «К вопросам ленинизма»).

Што побач з мірнымі, арганізатарскімі, культурнымі бакамі нашай дыктатуры не адпала неабходнасць у гвалтоўных яе баках, наглядна паказвае толькі-што абмеркаванае намі пытанне аб справе Бухарына—Рыкава. Дыктатуры рабочага класа і ў далейшым прыдзецца бязлітасная рукой перамагаць супраціўленне астаткаў варожых капіталістычных класаў і агентаў фашыстскай буржуазіі — трацкістаў, зіноўеўцаў, правых і іншых ворагаў народу.

Таварыш Сталін вучыў нас, што нам патрэбна моцная і магутная дыктатура рабочага класа для таго, каб развеяць упрах апошнія астаткі паміраючых класаў і разбіць іх злазлейскія махінацыі.

Правядзенне дэмакратычных выбараў — гэта справа вельмі сур'ёзная. Гэта вельмі сур'ёзны экзамен для нашай партыі ў сэнсе праверкі яе сувязі з масамі, працаздольнасці і аўтарытэта нашых партыйных арганізацый у масах. Правядзенне выбараў патрэбуе велізарнай напружанасці ўсіх сіл нашай партыі.

Каб сустрэць гэты паварот у палітычным жыцці нашай краіны ва ўсёзбраенні, наша партыя павінна стаць на чале гэтага павароту і забяспечыць сваю кіруючую ролю ў выбарах вярхоўных органаў краіны.

Што значыць узначаліць і забяспечыць кіруючую ролю партыі ў выбарах вярхоўных органаў? Якія задачы павінна будзе вырашыць партыя?

Перш за ўсё трэба мець на ўвазе, што нашы работнікі будуць мець справу з вядомай навізнай становішча. Мы ўпершыню праводзім выбары па новай выбарчай сістэме. У нас няма навыкаў да выбараў па асобных кандыдатурах, па прынцыпу тайнага галасавання і т. д. Гэта прадстаўляе вядомую цяжкасць для нашых партыйных арганізацый.

Па-другое, узначаліць паварот у палітычным жыцці нашай краіны і кіраваць выбарамі — гэта значыць забяспечыць поўнае захаванне новай выбарчай сістэмы, устаноўленай Канстытуцыяй, г. зн. строга захоўваць прынцыпы ўсеагульнага, прамога, роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні. Гэта значыць, што нашы партыйныя арганізацыі павінны ахоўваць, як зяніцу вока, наш новы выбарчы закон ад усякіх парушэнняў.

Трэцяе, нашы партыйныя арганізацыі павінны быць гатовы да выбарчай барацьбы. Пры выбарах нам прыдзецца мець справу з варожай агітацыяй і варожымі кандыдатурамі. Што такая магчымасць з'яўляецца рэальнай, відаць з таго, што ўжо зараз мае месца вядомае ажыўленне антысовецкіх элементаў, іменна ў сувязі з падыходзячымі выбарамі. Нашы партыйныя арганізацыі павінны ва ўсёзбраенні сустрэць спробы варожых элементаў скарыстаць легальныя магчымасці, прадастаўляемыя новай Канстытуцыяй.

Пакуль нашы людзі дрэмлюць і раскачваюцца, ворагі ўжо дзейнічаюць і моцна рыхтуюцца да выбараў.

Чацвертае, тайнае і персанальнае галасаванне ў адрозненне ад галасавання адкрытага і па спісах будзе азначаць павышэнне адказнасці партыі за кожную высоўваемую кандыдатуру. Для таго, каб быць абранымі, нашы кандыдаты павінны быць добра вядомы выбаршчыкам той акругі, дзе яны будуць высунуты, іх дзейнасць павінна быць добра вядома выбаршчыкам.

Праверка тайным галасаваннем будзе самай грунтоўнай праверкай нашых работнікаў, бо тайнае галасаванне прадстаўляе куды больш шырокія магчымасці адводу непажаданых і нягодных з пункту гледжання мас кандыдатур, чым гэта было да гэтага часу. Гэта трэба выразна ўяўляць.

Пятае, трэба перамагчы шкодную псіхалогію, якая ёсць у некаторых нашых партыйных і совецкіх работнікаў, якія думаюць, што народнае давер'е можна атрымаць дарам і што можна спажойна спаць, чакаючы падняцення дэпутацкіх мандатаў на-дом, пад гром апладысментаў, у сілу ранейшых заслуг. Атрымаць давер'е дарам, — гэта не выйдзе пры тайным галасаванні.

У нас ёсць даволі значны слой работнікаў у партыйных і совецкіх арганізацыях, якія лічаць, што іх задача, уласна, скончана тады, калі яны абраны ў совет. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць адказных работнікаў, якія не наведваюць пленумаў советаў, дэпутацкіх груп і секцый нашых советаў, якія ўхіляюцца ад нясення элементарных дэпутацкіх абавязкаў.

Такога роду перажыткі ў псіхалогіі нашых работнікаў неабходна зламаць, трэба выхаваць у нашых работнікаў усведамленне сваёй адказнасці перад выбаршчыкамі, маючы на ўвазе, што кожны абраннік будзе праглядзян і праверан самімі масамі дасканальна і ўсебакова.

Было-б грубай памылкай адкладваць барацьбу з гэтымі перажыткамі да моманту выбараў. Без адняжкі мы павінны ўзяцца за няўхільнае паляпшэнне работы нашых совецкіх арганізацый, сувязь іх з масамі, узмацненне адказнасці нашых совецкіх работнікаў перад масамі.

Шостае, трэба ўжо пачаць выхоўваць у работнікаў усведамленне таго, што новая выбарчая сістэма азначае куды больш шырокую гласнасць у дзейнасці совецкіх арганізацый і што іх дзейнасць будзе праходзіць на відавоку ў мас, што адказнасць іх перад масамі будзе больш поўнай. Многія дэпутаты советаў — члены нашай партыі — прывыклі адказваць толькі перад сваёй партыйнай арганізацыяй. Шмат якія нашы совецкія работнікі з людзей, схільных да бюракратызма, маючых буйныя недахопы ў рабоце, гэтаму дзесяць раз адчытаны ў сваёй рабоце перад бюро партыйнага камітэта, у вузкім сямейным коле, чым выйсці на пленум совета, крытыкаваць сябе і выслухаць крытыку мас. З такой практыкай безадказнасці трэба пакончыць.

Сёмае, узначаліць паварот у палітычным жыцці краіны і забяспечыць дэмакратычныя выбары — гэта азначае, што нашы партыйныя арганізацыі не павінны чакаць, калі масы штырхнуць іх знізу ў адносінах крытыкі і адводу нашых кандыдатур, а павінны самі быць на чале крытыкі і адводаў нягодных кандыдатур, не чакаючы іх правалу пры тайным галасаванні. Пры гэтым нашы партыйныя арганізацыі павінны навучыцца адрозніваць сяброўскую крытыку ад варожай. У нас нярэдка бывае так, што нездавальненне працоўных асобнымі недахопамі і скажэннямі ў дзейнасці нашых совецкіх органаў распаўсюджваецца і разглядаецца як варожая крытыка. Уменне адрозніваць сяброўскую крытыку, якая часам бывае вельмі вострай, ад крытыкі ворага патрабуе ад нашых партыйных арганізацый высокага ўзроўню партыйна-палітычнага выхавання і вялікай чуласці.

У часе новых выбараў магчымы спробы агітацыі супроць нашых кандыдатаў з боку варожых элементаў. Нашым работнікам прыходзіцца весці не мала цяжкіх кампаній на розных участках загатоўчай работы, будаўніцтва і т. д., а такога роду кампаніі не абходзіцца без вядомага націску. Гэта ўвахоўзіць у разуменне дыктатуры рабочага класа. Мы не адмаўляемся ад гэтага націску і ў далейшым, і было-б смешна ад гэтага адмаўляцца. Будзе, як відаць, дэмагогія наконт разгулвання ўсякага роду недахопаў нашых работнікаў па гэтай лініі. Гутарка ідзе аб кадрах нашых сельсоветчыкаў, райвыканкомшчыкаў і т. д. Партыйныя арганізацыі павінны умець узяць пад абарону гэтых людзей. Гэтага нельга выпускаць з-пад увагі.

Восьмае, пытанне адносна беспартыйных. Было-б вельмі шкодным і небяспечным, калі-б пры новых выбарах былі паўтораны памылкі, меўшыя месца ў старой практыцы выбараў і якія заключаліся ў няўважлівых адносінах да кандыдатур беспартыйных, калі ў мэтах забяспячэння партыйнага ўплыву ў советах беспартыйныя кандыдатуры не карысталіся неабходнай увагай і падтрыманнем, якія выцякаюць з асноў большэвіцкага разумення кіраўніцтва і сувязі з масамі. Майце на ўвазе, што комуністаў у нашай краіне 2 мільёны, а беспартыйных «некалькі» больш. Стала быць, мы павінны, калі хочам узначаліць выбары, узмацніць наш уплыў і сувязі з беспартыйнымі і падтрымліваць, а не адцяняць беспартыйныя кандыдатуры, якія карыстаюцца давер'ем мас.

Такавы некаторыя пытанні, датычныя кіраўніцтва і арганізацыі падрыхтоўкі да выбараў. Яны сталі на чаргу не ў парадку аддаленай перспектывы, а ў парадку бяжвой, зусім неадкладнай і надзённай задачы.

ПАРУШЭННЕ ВЫБАРНАСЦІ ПАРТЫЙНЫХ ОРГАНАЎ НЕСУМЯШЧАЛЬНА З АРГАНІЗАЦЫЙНЫМІ ПРЫНЦЫПАМІ БОЛЬШЭВІЗМА

Што патрабуецца ад партыі для таго, каб яна магла стаць на чале новых, да канца дэмакратычных выбараў? Якія галоўныя ўмовы, што забяспечваюць кіраўніцтва партыі паваротам у палітычным жыцці краіны?

Для гэтага патрэбна, каб партыя сама праводзіла пасляўоўную дэмакратычную практыку, каб яна праводзіла да канца ва ўнутрыпартыйным жыцці асновы дэмакратычнага цэнтралізма, як гэтага патрабуе статут нашай партыі, каб партыя сама мела неабходныя ўмовы, у сілу якіх усе органы партыі з'яўляліся-б выбарнымі, каб крытыка і самакрытыка ўнутры партыі развівалася ў поўнай меры, каб адказнасць партыйных органаў перад партыйнай масай была поўнай і каб сама партыйная маса была поўнасцю актывізавана.

Ленінізм вучыць, што ўздым актыўнасці рабочага класа, якога мы дабіваемся ў сувязі з правядзеннем совецкага дэмакратызма да канца, — справа сур'ёзная і вялікая. Для таго, каб узняць актыўнасць рабочага класа, трэба перш за ўсё актывізаваць саму партыю. Трэба, каб сама партыя цвёрда і рашуча стала на шлях унутрыпартыйнай дэмакратыі, каб нашы арганізацыі ўцягвалі ў абмеркаванне пытанняў нашага будаўніцтва шырокія масы партыі, якія творань лёс нашай партыі. Без гэтага няма чаго і гаварыць аб актывізацыі рабочага класа. Гэтаму вучыць нас таварыш Сталін.

Ці можна сказаць, што ўсе нашы партыйныя арганізацыі ўжо гатовы выканаць гэтыя ўмовы і што яны ўжо перабудаваліся на дэмакратычны лад? На жаль, гэтага з поўнай упэўненасцю сказаць нельга.

Якія-ж факты сведчаць аб тым, што гэтага нельга сказаць з поўнай упэўненасцю?

Аб гэтым гаворыць маючаяся ў некаторых арганізацыях практыка парушэння статута партыі і асноў унутрыпартыйнага дэмакратызма.

Якія гэтыя парушэнні?

Статутам партыі, як вядома, прадпісваецца правядзенне выбараў камітэтаў первічных арганізацый адзін раз у год, гарадскіх і раённых камітэтаў адзін раз у год, абласных, краявых камітэтаў і цэнтральных камітэтаў нацыянальных компартый — адзін раз у паўтара гады. — Так гаворыць статут.

Калі звярнуцца да практыкі, то факты гавораць аб тым, што гэта патрабаванне статута парушана ў нас у цэлым рэдзе арганізацый. За апошнія 2—3 гады выбары абласных, краявых камітэтаў і ЦК нацкомпартый праводзіліся толькі ў тых арганізацыях, якія створаны нанава, у сувязі з фармаваннем новых абласцей (калінінская, красная, омская, оранбургская і яраслаўская арганізацыі). Большасць нашых абласных, краявых камітэтаў і ЦК нацкомпартый, гаркомаў, райкомаў і первічных парткамітэтаў існуюць з перыяда XVII з'езда партыі, г. зн. з перыяда, калі адбываецца агульная кампанія выбараў парторганаў. Выключэнні з гэтага становішча складаюць, як я ўжо гаварыў, новыя краі і вобласці, а таксама асобныя раённыя і гарадскія арганізацыі, галоўным чынам, у сувязі з праваламі ў партыйнай рабоце.

Значыць, законы нашай партыі апракінуты, хоць мы клянемся і божымся статутам, зубрым яго ў гуртках, патрабавалі ў часе праверкі і абмену партдакументаў ад членаў партыі ведання статута. Выходзіць на паверку, што самі мы недапушчальна ліберальна адносімся да нашых уласных партыйных законаў.

Статутам нашай партыі прадпісваецца, далей, выбарнасць усіх кіруючых органаў партыі зверху данізу. Гэтага патрабуе асноўны прынцып арганізацыйнай будовы нашай партыі — прынцып дэмакратычнага цэнтралізма.

Параграф 18 статута партыі гаворыць, што «кіруючым прынцыпам арганізацыйнай будовы партыі з'яўляецца дэмакратычны цэнтралізм, які азначае:

а) выбарнасць усіх кіруючых органаў партыі зверху данізу;

б) перыядычную справаздачнасць партыйных органаў перад сваімі партыйнымі арганізацыямі;

в) суровую партыйную дысцыпліну і падпарадкаванне меншасці большасці;

г) безумоўную абавязковасць рашэнняў вышэйшых органаў для ніжэйшых і для ўсіх членаў партыі».

Гэты асноўны арганізацыйны прынцып нашай партыі ў радзе арганізацый парушан. Членам пленума, мабыць, ужо вядома, да якіх шкодных вынікаў для нашай партыйнай справы прывяла практыка парушэння статута партыі ў кіеўскай, азова-чорнаморскай і іншых арганізацыях, дзе забыцё статута ў сэнсе адыходу ад выбарнасці прывяло да абураючай запушчанасці партыйнай работы і салзянічала пранікненню варожых элементаў у кіруючыя партыйныя органы.

Такім сур'ёзнейшым парушэннем статута нашай партыі ў адносінах выбарнасці з'яўляецца нічым не апраўдваемае пашырэнне каптацыі розных кіруючых работнікаў у члены пленумаў парткомаў, райкомаў, гаркомаў, абкомаў, крайкомаў і ЦК нацкомпартый.

Даныя, якія ёсць у распараджэнні ЦК ВКП(б), гавораць, што шкодная практыка каптацыі ўкаранілася і зайшла далёка. Практыка каптацыі парушае законнае права членаў партыі прымаць удзел у выбарах сваіх кіруючых органаў. Пры каптацыі-ж члены партыі пазбаўляюцца магчымасці ўдзельнічаць у выбарах, магчымасці адводу нягодных кандыдатаў, іх думкі, наогул не пытаюцца, бо каптацыя праводзіцца на пленуме.

Каптацыя прымяняецца вельмі шырока. Гэта парок, якім хварэе цэлы рад арганізацый.

У абкомах, крайкомах і ЦК нацкомпартый каптаваных у члены пленумаў 11,6 проц. Гэта — сярэдняя лічба. Па асобных арганізацыях процант каптаваных даходзіць да 22,8 проц. (кіеўская) і нават да 26,2 проц. (Беларусь), г. зн. больш чацвертай часткі пленума складаецца з каптаваных.

Працяг даклада тав. А. А. ЖДАНАВА на 2-й стар.

ПРЫВІТАННЕ ПАШЫРАНАГА ПЛЕНУМА ЦК КОМПАРТЫІ ІСПАНІІ ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ ВКП(б)

«Пашыраны пленум Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі Іспаніі вітае слаўную большэвіцкую партыю Совецкага Саюза — кіраўніка вялікага соцыялістычнага народу. Перад салідарнасцю гэтага народу з нашай справай уся антыфашысцкая Іспанія схіляе свае сцягі, пакрытыя славай на франтах барацьбы супроць фашысцкіх орд, якія ўварваліся ў краіну.

Мы вітаем у вашай асобе і ў асобе вашага геніяльнага правадыра — вялікага Сталіна лепшых прыяцеляў Іспаніі і яе змагароў. Мы змагаемся за такое-ж свабоднае, мірчае і шчаслівае жыццё, якое выкавалі вы для свайго народу, умацаваўшы яго новай Канстытуцыяй, якая з'яўляецца зараз сцягам барацьбы ўсяго цывілізаванага чалавецтва.

ЦК КОМПАРТЫІ ІСПАНІІ».

20-годдзе ЛЮТАЎСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

20 год таму назад пролетарыят Расіі ўстаў і скінуў ненавіснае народу самадзяржаўе.

300 год кіравала дынастыя Раманавых, залтам, турмамі, шыбеніцамі, катаргай, згромам і жорсткім падаўленнем рэволюцыйнага руху ў Расіі і на Захадзе яна набыла сабе славу сусветнага жандара. Увесь свет ненавідзеў панаванне выраджаўшагася, у корані згніўшага самадзяржаўнага дома. Рускага цара ведалі рабочыя за граніцай, адчуўшы на сабе яго біч і кулі. Уздох аблягчэння і радасці ірваўся ва ўсіх, каму дорагі былі інтарэсы чалавецтва, калі дынастыя была скінута.

Прадуктам выраджэння і загнівання дома Раманавых быў Нікалай другі. Забаўны і трусліва Нікалай другі баяўся рэволюцыі больш усяго. На ўсякі сігнал усіх апрычнікаў-жандараў ён нязменна адказваў:—паслаць у турму, расстраляць. Колькі таленавітых сыноў, колькі лепшых сыноў народу ён адправіў на шыбеніцы, у турмы, на смерць. Таксама ён думаў падавіць і пачаўшуюся лютаўскую рэволюцыю. «Загалваю, — пісаў ён генералу Хабалаву 25 лютага 1917 года,— заўтра-ж спыніць у сталіцы непарадкі». Але спыніць непарадкі крываваму Нікалаю не ўдалося. Народ, знайшоўшы сілы для расправы з ненавісным царом, змораны пяжкай вайной, якую ўрад вёў у інтарэсах кучкі рускіх фінансавых тузоў, абсіраўны, галодны, моцна трымаў у руках сцяг паўстання, апраўдваючы выпатыя словы Леніна, што Расія «здольна стаць чалавецтву вялікія ўзоры барацьбы за свабоду і за соцыялізм, а не толькі вялікія пагромы, рады шыбеніц, заспенні, вялікія галадоўкі і вялікае рабалепства перад панамі, царамі, памешчыкамі і капіталістамі».

З першых-жа дзён рэволюцыі буржуазія спрабавала зраварыцца з самадзяржаўем на кошт рабочых і сялян, прапануючы Нікалаю перадаць прастол свайму брату Міхаілу Раманаву. Бандыт Каменеў, зараз расстрэлены, як патхніпель і забойца Сергея Міронавіча Кірава, паслаў прывітальную тэлеграму Міхаілу, зрабіўшы тым самым небывалае па сваёй подласці здрадніцтва інтарэсаў народу.

Народнае паўстанне не дало ажыццявіцца гнусным планам буржуазіі. З самадзяржаўем у лютаўскія дні народ расправіўся назаўсёды, паклаўшы пачатак бурнаму рэволюцыйнаму руху ва ўсім свеце.

«Русяім рабочым,—пісаў тады Ленін,— быў на долю гонар і шчасце першым пачаць рэволюцыю, гэта значыць вялікую, адзіна законную і справядлівую вайну супроць прыгнятальнікаў».

Разам з салдатамі пецербургскія рабочыя, а за імі рабочыя, салдаты і сяляне ўсёй Расіі зламалі паліцэйскі апарат Расіі, стварыўшы советы, але ўлады не ўзялі. Меншавікі і эсэры ўсыпілі пільнасць рабочых і сялян, дапамагалі буржуазіі ўгледзешча і прыбраць уладу да сваіх рук. Нямала ў гэтым дапамаглі меншавікам Троцкі, Пятакоў і Бухарын сваёй антыбольшэвіцкай прапагандай перад рэволюцыяй.

Атэізм свет прыгнятальнікаў і іх прыслужнікаў згвалтуюся, каб схапіць за горла паўстаўшых рабочых і сялян. Заклікаючы да патрыятычных пачуццяў, у інтарэсах быццам-бы радзімы, а на самой справе ў інтарэсах кучкі капіталістаў, часовы ўрад буржуазіі, урад, які складаўся з акцябрыстаў Львова, Гучкова і кадэтаў Мілюкова, Мануілава, Шынгарова і краснабая эсэра Керэнскага, заклікаў салдат да пераможнай вайны з Германіяй, а народ да супакаення.

«Разумеецца, — пісаў Ленін, — рабочыя не маглі давяраць такому ўраду...

Рабочыя адразу зразумелі, што для барацьбы за мір, за хлеб і за свабоду працоўныя класы, рабочыя, салдаты і сяляне, павінны арганізавацца, згуртавацца, аб'яднацца асобна ад капіталістаў і супроць іх. І пецербургскія рабочыя, перамогшы царскую манархію, зараз-жа стварылі сваю арганізацыю, советы рабочых дэпутатаў, зараз-жа прыняліся ўмацоўваць і распіхваць яе, ствараць самастойныя советы салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў».

Большэвікі стаялі на баку інтарэсаў паўстаўшага народу. Ленін і Сталін нястомна растлумачвалі масам сутнасць пераваротаў, выкрывалі махінацыю ўрада, меншавікоў і эсэраў, заклікаючы масы да таго, каб зрабіць ужо існаваўшыя советы адзінай, а не другой, як гэта было тады, уладай у краіне.

Лютаўская рэволюцыя дала масам, пакаваўшым на вуліцы, велізарныя палітычныя свабоды. Кожны дзень прыносіў народу ўрокі і ўсё новыя доказы справядлівасці закліку большэвікоў не давяраць ураду капіталістаў, арганізоўвацца асобна ад капіталістаў.

Партыя Леніна — Сталіна, стаючы на варце інтарэсаў рэволюцыйнага народу ў гэтыя дні ўсеагульнага лікавання і захаплення свабодамі, сачыла за паваротамі контррэволюцыі. «Можна апасацца, — пісаў у гэтыя дні Сталін, — што часовы ўрад, напалоханы размахам рэволюцыі і прасякнуты імперыялістычнымі тэндэнцыямі, можа паслужыць пры пэўнай палітычнай кан'юнктуры «законным» шчытом і прыкрыццем арганізуючайся контррэволюцыі». Таварыш Сталін патрабаваў «абрэзаць крылы пазмаючайся контррэволюцыі».

Класавае недавер'е да ўрада буржуазіі і рэволюцыйная пільнасць большэвікоў да паваротаў контррэволюцыі былі ўмоцнай, якая ў канечным выніку дала перамогу пролетарыяту.

20 год аддзяляюць нас ад дзён Лютаўскай рэволюцыі. Гэтыя дваццаць год былі трыумфальным шэствіем рабочага класа СССР. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна рабочы клас дабіўся перамог сусветна-гістарычнага маштаба, пабудаваўшы соцыялізм. Ажыццявілася поўнасцю і цалкам прадраканне Леніна, выказанае ім яшчэ ў 1914 годзе ў артыкуле аб нацыянальнай гордасці вялікаросаў: рабочы клас СССР стаў «галоўным рухавіком комуністычнай рэволюцыі».

У краіне адбыўся велізарны паварот у сувязі з прыняццем Сталінскай Канстытуцыі. Геройчная партыя большэвікоў, стаяўшая на чале мас у баях у 1905 годзе, узначальваўшая рабочы клас у лютаўскія дні 1917 года, арганізаваўшая масы на барацьбу за перамогу дыктатуры пролетарыята і соцыялізма, павышаючы рэволюцыйную пільнасць, узбройваючы рабочы клас і, перш за ўсё, жэмуцістаў для барацьбы з поллай кучкай трацкістаў і іх апошнікаў — правых,—павядзе грамадзян вялікай радзімы працоўных усяго свету да комунізма.

ПАПЯРЭДЗІЛІ КРУШЭННЕ

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). 11 сакавіка на 21 кіламетры ўчастка Віцебск — Орша ў таварным поездзе № 737 здарыўся абрыў хваставой часці. Адарваныя 3 вагоны развілі вялікую хуткасць і наганялі састаў, як наближаўся да ст. Замасточча. Крушэнне было неміну чуча.

Старшы кандуктар поезда т. Цярэшчанка, бачачы, што падаваемыя ім сігналы аб абрыве паравозным брыгадай не заўважаюцца, прыняў быстрае рашэнне: калі поезд праязджаў міма станцыі Замасточча, ён кінуў дзяжурнаму па станцыі т. Калесніку барышмак і знакамі даў зразумець, што хвост поезда аборван. Тав. Калеснікаў пад імчаўшыеся вагоны падкладаў башмак і затармазіў іх. Крушэнне было прадухілена. Выратаваны людзі, вагоны і каштоўны груз.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

6,5 ТЫСЯЧ МЕТРАЎ ТАВАРУ ЗВЫШ ПЛАНА

У цэхах скурзавода «Большэвік» адбыліся агульныя сходы рабочых, прысвечаныя абмеркаванню закліку стаханаўцаў вугальнай і металургічнай прамысловасці Данбаса. Стаханаўцы ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па далейшаму павышэнню прадукцыйнасці працы.

Стаханаўка Вінакурава (клеезарачны цэх), узнагароджаная граматай ЦВК БССР, абавязалася на працягу 1937 года выконваць сваю норму не ніжэй, як па 160 проц., стаханавец Баешка — на 140 проц.

Калектыў першага хромавага цэха абавязаўся перавыкананць сакавіцкі план на 4,5 тыс. метраў галантарэйнага тавару. Стахановец Матусевіч узяўся выконваць на сваім працэсе — дзёрганне шчэпіны — па дзве нормы.

Выступаючыя стаханаўцы патрэбавалі ад адміністрацыі забяспечыць іх рабочае месца і добра наладзіць машыны.

Другі хромавы цэх таксама абавязаўся даць у гэтым месяцы на 2 тыс. метраў галантарэйнага тавару звыш плана, выпускаць з буйнай свіной скуры тонкі, прыгожы галантарэйны тавар, вырасціць новых стаханаўцаў.

ПАДРЫХТОЎКА ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР ПА НОВАЙ ВЫБАРЧАЙ СІСТЭМЕ І АДПАВЕДНАЯ ПЕРАБУДОВА ПАРТЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОТЫ

Даклад таварыша А. А. ЖДАНАВА на Пленуме ЦК ВКП(б) 26 лютага 1937 года

(Працяг. Пачатак гл. на 1 стар.)

У складзе райкомаў і гаркомаў кааптаваных: у маскоўскай арганізацыі 17 проц., у ленінградскай 17,2 проц., у азова-чорноморскай 17,5 проц., у дніпрапетроўскай 26,7 проц., у беларускай 28,9 проц., у варонежскай 29,8 проц., у армянскай 30 проц., г. зн. амаль адна трэць кааптаваных.

У складзе бюро райкомаў і гаркомаў па абласных арганізацыях процант кааптаваных хістаецца ў сярэднім ад 14 да 59 проц. абраных. У Заходняй вобласці, у Арменіі, у іванаўскай і карэльскай арганізацыях больш паловы членаў бюро райкомаў і гаркомаў з'яўляюцца кааптаванымі. Тут ужо не разбярэш, што асталося ад законнага складу, які вядзе свой пачатак ад выбараў.

Размах кааптацыі даходзіць да таго, што, напрыклад, на пленуме кізўскага абкома 19 кастрычніка 1934 года было кааптавана ў пленум адразу 14 чалавек, і ў тым ліку Ашраф'ян, Дзэніс, Сенчэнко, Тодэр і інш., выкрытыя ў сучасны момант як ворагі партыі.

У Харкаве у гаркоме партыі з 158 членаў гаркома і 34 кандыдатаў, абраных на IV гарадской партыйнай канферэнцыі, асталося толькі 59. Нельга назваць гэты склад законным, бо асталася толькі адна трэць абраных. За час-жа з апошняй партыйнай канферэнцыі ў склад гаркома кааптаван 61 ч., прычым бюро гаркома, за выключэннем аднаго таварыша, складаецца цалкам з кааптаваных.

Вам вядома, да якога стану спраў у партыйнай арганізацыі прывяло такое становішча ў Харкаве.

Калі звярнуцца да асобных раённых камітэтаў партыі, то, відавочна, вы самі маеце дастаткова абшырны матэрыял наконт кааптацыі. Я думаю, што ў нас ёсць не адзін дзесятак райкомаў, у якіх большасць членаў райкома з'яўляецца не абранымі, а кааптаванымі. Напрыклад, у Мала-Архангельскім раёне (Курскай вобласці) з 23 чал. 18 кааптавана, у Мцэнскім раёне (Курскай вобласці) з 26 кааптавана 22, у гомельскім гаркоме (Беларусь) з 52 кааптавана 40, у Ораніенбаумскім раёне (Ленінградскай вобласці) з 22 кааптавана 15, ва Усцюжэнскім раёне (той-жа вобласці) з 12 кааптавана 11 і г. д.

У складзе бюро асобных гаркомаў і райкомаў кааптацыя практыкуецца таксама шырока. Ульянаўскі гарадскі камітэт мае з 12 членаў бюро 11 кааптаваных. Шчучанскі раённы камітэт (Чэлябінскай вобласці)—усе члены бюро кааптаваны. Семіпалацінскі райком (Усходне-Казахстанскай вобласці)—усе члены бюро кааптаваны. Асбестаўскі гарком (Свердлоўскай вобласці)—усе члены бюро кааптаваны і г. д.

Прыёмы кааптацыі дайшлі да таго, што часамі кааптуе або выключае са складу пленума меншасць, г. зн. аб законным кворуме тут ніжай гуткарі быць не можа. Гэта паказвае, што разуменне аб кворуме ў цэлым разе месц сперлася, страцілася. Напрыклад, у Ленінскім раёне г. Харкава 4 красавіка 1936 г. збіраецца пленум райкома разам з актывам, на якім ставіцца пытанне аб выключэнні са складу райкома цэлай пачкі людзей. Не глядзячы на тое, што прайшло нямала часу пасля вядомага рашэння ЦК, што актывы павінны збірацца асобна ад пленумаў,—збіраюць пленум райкома разам з актывам. Навошта гэта спатрэбілася? Затым, што ў пленуме «нехапіла» выбарных членаў. З членаў райкома прысутнічала 10 або 11 чалавек, аднак пленум вывеў са свайго складу 12 чалавек. 10 чалавек зжэрлі 12 чалавек! (Смех).

Таварышы, мабыць, забылі, што нават і ў перыяд нелегальнага існавання партыі, калі кааптацыя выклікалася неабходнасцю, яна была абстаўлена цэлым радам абмежавальных умоў.

Мала таго, што кааптуюць пленумы, ёсць арганізацыі, якія ідуць яшчэ далей. Напрыклад, пленум Тужынскага райкома, Кіраўскай вобласці, вынес рашэнне, згодна якому новаму складу бюро даручалася кааптацыя ў склад членаў райкома. На падставе гэтага рашэння пленума бюро райкома кааптавала 7 чал. і зацвердзіла кааптацыю на пленуме толькі праз 5 месяцаў, прычым прысутнічала на зацвярджанні гэтых 7 членаў райкома толькі 6 законна абраных членаў пленума райкома.

Практыка парушэння выбарнасці і падмены яе кааптацыяй захапіла вельмі многія кіруючыя арганізацыі, а пры іх папучнальнасці па той-жа дарожцы пайшлі і пярэчныя партыйныя арганізацыі. У нас у Ленінградзе, напрыклад, партком канапнерскага завода абран быў да XVII з'езда, і за тры гады, пры складзе парткома ў 7 чалавек, было кааптавана 22 чалавекі, г. зн. партком тройчы змяніў свой склад без нармальных выбараў.

На кіраўскім заводзе асталося 3 са складу абраных, астатнія ўсе кааптаваны.

У партком завода імя Жданава ў розны час быў кааптаван 31 чалавек.

У сувязі з тым, што парушэнне тэрмінаў выбараў і кааптацыя сталі ў нас распаўсюджанай з'явай, у радзе арганізацый забыліся, каго выбіралі. Іменна на аснове гэтага маглі атрымацца такія факты, аб якіх вы чыталі ўчора ў «Правде», калі ў Одэсе згубілі члена абласнога камітэта партыі тав. Олейнікава і ўспомнілі аб ім праз два гады, калі ён, занепакоены тым, што яго ніхто не чапае і не выклікае, сам з'явіўся ў абласны камітэт.

У Ленінградскай вобласці у партарганізацыі завода «Красный керамик», у Баровічах, 4 студзеня 1937 г. стаяла пытанне аб лавыбарах партыйнага камітэта. Чытаю па пратаколу: «Сакратар парткома тав. Радзіонаў інфармуе аб выкананні імаруччання партсхода ў частцы «дакументальнага ўдакладнення» складу парткома. Ён паведаміў, што па дакументах, якія ёсць у парткома, членамі парткома з'яўляюцца Свідэрскі, Кузняцова, Данілаў і Радзіонаў. Лічацца ў спіску парткома, але не пацвярджаюцца дакументамі Громава, Сокалаў, Калінін. Пастанавілі: уносці яснасць у склад парткома і даабраць у яго прапаўзольных таварышоў».

Між іншым, па самым сходзе два члены партыйнага камітэта, якіх лічылі законна абранымі, катэгарычна ад гэтага адрокаліся, іх горача пераконвалі. Сакратар парткамітэта расказваў пасля аб цяжкасцях выканання даданага яму даручэння «адшукаць» членаў парткома: «Уф, шукаў, шукаў членаў парткома, чуць іх знайшоў».

Так абстаіць справа з грубым парушэннем законаў нашай партыі аб выбарнасці партыйных органаў і з падменай выбарнасці практыкай кааптацыі, несумяшчальнай з духам і традыцыямі нашай партыі.

УНУТРЫПАРТЫЙНАЯ ДЭМАКРАТЫЯ— НЕПАХІСНЫ ЗАКОН ПАРТЫЙНАГА ЖЫЦЦЯ

Аб практыцы саміх выбараў. Механіка выбараў у нас зачастую пабудавана так, што члены партыі пазбаўлены магчымасці свабодна выказвацца па кандыдатурах, скарыстаць права адводу і крытыкі непрымальных кандыдатаў. Арганізацыя выбараў накіравана не на тое, каб забяспечыць сапраўдную магчымасць праверкі кожнай кандыдатуры партыйнай масай, а на тое, каб як мага хутчэй, праспей правесці выбары і пазбавіцца ад дакучлівай крытыкі партыйных мас у дачыненні да той або іншай кандыдатуры. У нас справа звычайна абстаіць так: сакратар партыйнага камітэта за некалькі дзён да канферэнцыі недзе ў кутку сваёй запісной кніжкі робіць папярэднюю прыкідку кандыдатаў. Затым склікаецца нарада сакратароў, на якой фарміруецца спіс. Затым абмеркаванне кандыдатаў перахоўзіць на «сіні канверт», як у нас называюць сеньёрэн-канвент, і на нараду дэлегацый. Абмеркаванне кандыдатур вычэрпваецца, такім чынам, на розных закрытых папярэдніх нарадах «сямейным» парадкам, без асобых «клопатаў». Зусім ясна, што калі нарады сакратароў і дэлегацый пытанне правырашылі, то назвычай цяжка адвесці якую-небудзь кандыдатуру на агульным сходзе ці канферэнцыі. На саміх канферэнцыях спрэчкі па кандыдатурах, як правіла, не адкрываюцца, галасаванне робіцца спісам, а не персанальна, і такім чынам выбарная працэдура ператвараецца ў простую фармальнасць. На канферэнцыях курс ставіцца на хуткасць. Старшыней саджаюць такога чалавека, які, закасаўшы рукавы, «правёртвае» выбары спісам мінут за 20. Тут дэманстрацыя поўнай аднадушнасці атрымліваецца, і для пярэчанняў па сутнасці няма магчымасці. Замест таго, каб даць магчымасць людзям на самой канферэнцыі прыняць удзел у абмеркаванні, адкрыць доступ шырокай крытыцы і адводу выстаўляемых кандыдатур, уся справа зводзіцца да вузкай арганізацыйнай «тэхнікі», якая мае адну мэту: адгарадзіцца ад крытыкі партыйных мас.

Такая практыка несумяшчальна з духам і традыцыямі нашай партыі і з тымі задачамі, якія перад намі стаяць. Яна прастаўляе завуаляванае парушэнне законных правоў члена партыі, парушэнне партыйнай дэмакратыі.

Аб кааптацыі я хацеў-бы зрабіць яшчэ адну заўвагу. Я хачу спаслацца на вопыт члена партыі Мазіна, які збіваў сваю жонку, запісала: «Не дапускаць больш сямейных глупстваў. У найкарацейшы тэрмін наладзіць сямейныя адносіны». (Агульны смех).

У соўгасе імя Амосава, у Казахстане, слухаюць самаправаздачу комуніста Салірава, прымаецца лапідарная пастанова: «Слухалі самаправаздачу Салірава. Пастанавілі: Салірава арыштаваць». (Агульны смех).

Галасы. За што?

Жданаў. Тут іншае пытанне ўзнікае, ці мае права партыйная арганізацыя арыштоўваць сваіх членаў? Адчытаўся чалавек на сваю галаву!

У шмат якіх партыйных арганізацыях прыніжана роля пленумаў, як органаў калектыўнага кіраўніцтва. Пленумы збіраюцца рэдка, больш для абмеркавання парадных ці агульных пытанняў, пытанні мясцовай работы ставяцца рэдка. Пытанні аб выбарах і іншыя пытанні, як я ўжо гаварыў, абмяркоўваюцца і вырашаюцца пры адсутнасці неабходнага кворума.

Вачскі райком, Горкаўскай вобласці, на працягу 1936 года не сабраў ні аднаго пленума. У Весялоўскім раёне, Дніпрапетроўскай вобласці, на працягу дзесяці месяцаў ні аднаго пленума не сабралі. У Чэлянінскім раёне ў Татарыі і ў радзе іншых райкомаў Татарыі ў 1936 годзе па 7—8 месяцаў не збіралі ні аднаго пленума. Дзе-ж тут калектыўнае кіраўніцтва?

Такія-ж недахопы па лініі прыніжэння ролі нашых выбарных арганізацый ёсць і ў пярэдніх партыйных арганізацыях.

У праекце рэзалюцыі ёсць указанне на тое, што мы павінны забяспечыць такое становішча, пры якім у пярэдніх партарганізацыях было-б забяспечана строгае захаванне парадку выбараў парткомаў на агульназаводскіх сходах, не дапускаючы падмены апошніх канферэнцыямі. Там-жа ўказваецца на неабходнасць ліквідаваць маючую месца ў радзе пярэдніх партарганізацый практыку фактычнай адмены агульных сходаў і падмены агульнага сходу пэхавымі сходамі і канферэнцыямі.

Уявіце сабе становішча на буйным заводзе, дзе ёсць тысяча—паўтары тысячы членаў партыі. Замест таго, каб сабраць для выбараў партыйнага камітэта агульназаводскі партсход, склікаюць па норме 1 дэлегат ад 3 членаў партыі заводскую канферэнцыю, падмяняюць тым самым агульназаводскі партыйны сход канферэнцыяй і робяць выбары, г. зн. па сутнасці справы двух чалавек з трох пазбаўляюць магчымасці ўдзельнічаць у выбарах. Ці дапушчальна гэта? Ясна, што ні ў якім выпадку недапушчальна.

Роля агульных сходаў прыніжана, у радзе арганізацый агульнапартыйныя сходы збіраюцца рэдка, пытаннямі мясцовага партыйнага жыцця займаюцца мала.

Парушэнні асноў унутрыпартыйнага дэмакратызма сказваюцца і на падрыхтоўцы партыйных сходаў, калі члены партыі не ведаюць загадзя, якія пытанні будуць абмяркоўвацца.

Аб падрыхтоўцы рэзалюцыі партсходаў. Нярэдка на партсходах рэзалюцыя па тым або іншым пытанні ўносіцца загадзя, або кропаецца майстрамі гэтай справы ў часе самога схода без уліку таго, аб чым гаворыцца ў спрэчках. У нас у модзе фармуліроўка: распрацаваць праект рашэння «на аснове абмену думкамі», а па справе якраз вось гэты «абмен думкамі» і не ўлічваецца.

Гэта — праява найвялікшай пенавагі да законных гаспадарскіх правоў члена партыі.

Беспарадачна і недобрасумленна-нядбайна адносяцца ў нас людзі да партыйных дакументаў і рашэнняў. Усім нам трэба вучыцца ў Цэнтральнага Камітэта адносінам да партыйных дакументаў. Калі мы падняслі цяпер ролю членскага білета і павагу да яго, то нельга гэтага сказаць аб вельмі многіх нашых іншых партыйных дакументах. Як яны складаюцца, выконваюцца, захоўваюцца? Неахайна. У ЦК нам трэба вучыцца выключнай дакладнасці, беражлівасці і акуратнасці да кожнага партыйнага дакумента. У нас у гэтых адносінах на мясцах шмат арганізацыйнай распушчанасці, нядбайнасці.

Зусім немалаважна, напрыклад, пытанне: ці атрымалі члены бюро партыйнага камітэта матэрыялы да абмеркавання на паседжанні або не, ці атрымалі іх за дзень раней або яны раздаюцца на самым паседжанні? Гэта таксама пытанне аб забеспячэнні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі.

Гэтыя пытанні здаюцца дробязнымі, але ў канечным выніку яны шкодзяць нам, паколькі перашкаджаюць росту актыва і затрудняюць для яго магчымасць актыўнага і самадзейнага ўдзелу ў жыцці партыі. У сувязі з гэтым развіваюцца і камандаванне і ўсякія іншыя справы.

Я хацеў-бы прывесці яшчэ адзін з прыкладаў парушэння прыпісанай калектыўнага кіраўніцтва. Гутарка ідзе аб так званых «трыкутніках». Пад выглядам «трыкутніка», які складаецца з сакратара парткома, кіраўніка прадпрыемства або ўстановы і старшыні мясцовай профарганізацыі, у нас у радзе арганізацый існуе ў баку ад нармальных выбарных органаў (парткома і заўкома) своеасаблівая, афіцыяльна і рэгулярна дзеючая, пізкімі партыйнымі і совецкімі законамі не прадугледжаная арганізацыя. Яна збіраецца, выносіць рашэнні, дае дырэктывы да выканання і г. д. З пункту гледжання калектыўнага кіраўніцтва, з пункту гледжання правільных адносін паміж партыйнымі, гаспадарчымі і профсаюзнымі арганізацыямі трыкутнік прадстаўляе сабою зусім недапушчальную форму. Гэта ёсць сямейственасць, змова для таго, каб цяжэй было крытыкаваць. І калі ўжо гэтыя трое сышліся, паспрабуй, пайдзі пакрытыкуй іх. Прафсаюзную і партыйную арганізацыю гэта абязлічвае, разбройвае ў барацьбе супроць недахопаў гаспадарчага кіраўніцтва, а з другога боку раззбройвае самога гаспадарніка, таму што трыкутнік прадстаўляе нешта накшталт якогасьці калегіяльнага органа кіраўніцтва, у той час як наша гаспадарчае кіраўніцтва зусім іншым чынам пабудавана.

Трыкутнікі прадстаўляюць сабою пародыю, карыкатуру, сурагат калектыўнага кіраўніцтва. Да чаго гэта прыводзіць? Вось у нас у Ленінградзе, на заводзе імя Калініна, выключылі комуніста з партыі за крытыку накіравільнага кіраўніцтва стаханаўскім рухам з боку заводакіраўніцтва, за тое, што ён указваў на недахопы ў кіраўніцтве. Яго залічылі ў бузацёры. Мы аднавілі яго ў правах члена партыі, пакаралі тых, хто ў адносінах яго паступіў самым беззаконным і грубым чынам. Але сам па сабе гэты факт стаў магчымым дзякуючы існаванню трыкутніка, які раней дамовіўся. Дырэктар прышпіў туды і гаворыць: абураючая справа, лаюць дырэкцыю. Яму паддакнулі сакратар і старшыня заўкома. Так атрымліваецца заціск крытыкі, і тады ўжо рабочым на такім заводзе цяжка дабіцца праўды.

Мне здаецца, пара паставіць пытанне аб ліквідацыі трыкутнікаў.

У чым заключаецца шкоднасць усіх указаных вышэй фактаў парушэння асноў дэмакратычнага цэнтралізма? Яна заключаецца ў тым, што падобная практыка тармозіць рост актыўнасці і самадзейнасці членаў партыі, прыніжае ў членаў партыі пачуццё гаспадара, перашкаджае ідэйнаму і палітычнаму росту членаў партыі, пазбаўляе членаў партыі іх законных правоў кантролю над дзейнасцю парторганаў і тым самым парушае правільныя ўзаемаадносіны паміж кіраўнікамі і партыйнымі масамі, аслабляе партыю перад тварам задач, якія стаяць перад ёю.

ЗНІШЧЫЦЬ УСЁ, ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ РОСТУ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА

Для ўсіх ясна, якія велізарныя кадры мы павінны мець для таго, каб паспяхова вырашаць задачы, дыктуемыя развіццём социялістычнага будаўніцтва ва ўсіх галінах, увядзеннем новай Канстытуцыі, нашай далейшай барацьбой за комунізм; колькі нам патрэбна адданых і самаахвярных таварышоў і ў партыі, і за межамі яе, сярод беспартыйных!

Мы павінны знішчыць у нашай партыйнай практыцы ўсё тое, што тармозіць, што перашкаджае росту актыва, развіццю яго самадзейнасці і павышэнню яго ролі ў кіраўніцтве партыйным жыццём, у абмеркаванні ўсіх пытанняў партыйнай палітыкі, як гэта выцякае з асноў унутрыпартыйнай дэмакратыі.

Таварыш Сталін пасталіна вучыць нас таму, што партыйны актыў мае асаблівае палітычнае значэнне ў жыцці нашай партыі. Ён з'яўляецца правадніком у жыццё рашэнняў нашай партыі. Калі партыйнае рашэнне вынесена, лёс яго знаходзіцца ў руках актыва. Партыйны актыў з'яўляецца выразнікам грамадскай думкі партыі.

Іменна таму, што наша партыя здолела выкаваць і выхаваць у духу Леніна—Сталіна шырокія слаі актыва, мы вырашылі з поспехам карэнныя задачы социялістычнага будаўніцтва, маем такія гіганцкія, казачныя перамогі.

Іменна ў гэтай сувязі было вынесена, па ініцыятыве таварыша Сталіна, вядомае рашэнне ЦК аб сходах партыйных актываў для абмеркавання рашэнняў ЦК ВКП(б).

Іменна таму мы павінны ўстараніць з нашага шляху ўсё, што перашкаджае расшырэнню кадраў нашага актыва, яго ідэйна-палітычнаму росту, яго большэвіцкай загартоўцы, яго арганізацыйнаму ўмацаванню. Задачы, якія мы павінны вырашыць і ў галіне социялістычнага будаўніцтва, і ў сувязі з наладжанымі новымі дэмакратычнымі выбарамі, ставяць на чаргу важнейшае пытанне аб актывізацыі кожнага комуніста.

Уся наша двухмільённая партыйная маса павінна быць поўнасцю актывізавана. Кожны комуніст павінен быць актыўным арганізатарам, агітатарам і прапагандыстам за справу партыі. Пад гэтым пунктам павінна быць перабудавана наша арганізацыйная, агітацыйная і прапагандысцкая работа.

Адна заўвага аб прапагандысцкай рабоце. Асноўны недахоп у нашай прапагандысцкай рабоце, на які не раз указваў ЦК, заключаецца ў тым, што яна вядзецца зачастую схаластычна, адарвана ад бягучых і надзённых баявых задач партыі. Наша прапаганда павінна быць пастаўлена так, каб задачай кожнага прапагандысцкага гуртка, кожнай школы было такое выхаванне комуністаў, пры якім папаўненне ведаў і ўдасканальванне членаў партыі ў навуцы марксізма-ленінізма з'яўлялася-б не самамэтай, а сродкам выхавання актыўных прапагандыстаў за справу партыі. Вось што трэба мець на ўвазе ў нашай прапагандысцкай рабоце, як адзін з яе важнейшых прынцыпаў.

Без ліквідацыі буйных недахопаў, якія мы маем у нашай унутрыпартыйнай практыцы, і ў першую чаргу па лініі парушэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і выбарнасці, не могуць быць вырашаны новыя задачы партыі, звязаныя з дэмакратычнымі выбарамі, і партыйныя арганізацыі могуць аказацца няздольнымі перад тварам гэтых задач. І калі мы хочам правесці выбары па новай выбарчай сістэме, так, як гэтага патрабуе партыя, так, як гэтага патрабуе Канстытуцыя, калі мы хочам дабіцца павагі ў нашых совецкіх і партыйных работнікаў да нашых законаў і мас да Совецкай Канстытуцыі, — то мы павінны забяспечыць перабудову партыйнай работы на аснове безумоўнага і поўнага правядзення пачаткаў унутрыпартыйнай дэмакратыі, прадугледжаных статутам нашай партыі.

***

Выходзячы з гэтага, нам неабходна правесці наступныя мерапрыемствы:

Па-першае, ліквідаваць безумоўна практыку кааптацыі і аднавіць у адпаведнасці са статутам выбарнасць кіруючых органаў партарганізацый.

Па-другое, забараніць пры выбарах парторганаў галасаванне спісам і перайсці ад адкрытага галасавання да тайнага і персанальнага галасавання. Пры гэтым павінна быць забяспечана неабмежаванае права адводу членамі партыі высоўваемых кандыдатур і неабмежаванае права крытыкі гэтых кандыдатур.

Неабходна ў сувязі з гэтым, з прычыны сур'ёзных парушэнняў выбарнасці ў нашых партыйных арганізацыях, правесці выбары партыйных органаў, пачынаючы ад парткамітэтаў пярэдніх арганізацый і канчаючы краявымі, абласнымі камітэтамі і ЦК нацкомпартый, правёўшы іх у бліжэйшыя два месяцы і закончыўшы выбары да канца мая. Неабходна ў далейшым строга захоўваць тэрміны выбараў парторганаў у адпаведнасці са статутам: у пярэдніх арганізацыях адзін раз у год, у раённых і гарадскіх арганізацыях—адзін раз у год, у краявых, абласных і рэспубліканскіх арганізацыях—адзін раз у паўтара года.

Што датычыць партыйных сходаў, неабходна катэгарычна асудзіць і забараніць практыку падмены агульных партыйных сходаў цэхавымі сходамі або канферэнцыямі і не дапускаць двухступеннага выбараў у партыйных арганізацыях. Зусім практыку выбараў нізавых партыйных органаў непасрэдна на агульных сходах.

Вось тыя прапановы, якія я меў ту сфармуляваць.

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА тав. ЖДАНАВА

на пленуме ЦК ВКП(б) 27 лютага 1937 года

Таварышы, у спрэчках было закранута і падверглася дыскусіі пытанне адносна перабудовы работы іншых арганізацый, галоўным чынам совецкіх арганізацый. Гаварылі тут і аб профсаюзах, і аб комсамоле, і аб іншых масавых арганізацыях. Гэта вельмі важная справа і, вядома, нам прыдзецца гэтыя арганізацыі перабудоўваць да выбараў у духу той работы, якую мы павінны правесці ў партыйнай арганізацыі.

Умовай перабудовы і совецкіх, і прафесіянальных, і комсамольскіх арганізацый з'яўляецца перш за ўсё перабудова самой партыйнай арганізацыі, як асноўнай кіруючай сілы, як асноўнага кіруючага ядра ўсіх нашых арганізацый, як гэта запісана ў нашай Канстытуцыі. Я не думаю, каб мы павінны былі адмовіцца і не весці ўжо пяпер работу па рашучаму палепшанню работы масавых арганізацый, профсаюзаў, совецтаў, комсамола і т. д., але сапраўдная перабудова іх работы, вядома, звязана з тым, у якой меры ўдасца перабудаваць партарганізацыям, — гэта корань усіх рэчаў.

Цяпер адносна парушэння выбарнасці партыйных арганізацый, распаўсюджання кааптацыі і аб іншых парушэннях унутрыпартыйнай дэмакратыі і асноў дэмакратычнага цэнтралізма. З спрэчак відаць, што справа зайшла вельмі далёка, што навыкі і перажыткі мінулага перыяда яшчэ моцна сядзяць у галовах нашых работнікаў, захопленых нашымі вялікімі поспехамі. Гэтыя навыкі і перажыткі несумненна, звязаны з некаторымі немарксісцкімі поглядамі, якія бічаваў таварыш Сталін яшчэ на XIII партканферэнцыі ў 1924 г. і якія зыходзяць з абсалютна немарксісцкіх уяўленняў, нібыта партыя наша з'яўляецца «не самадзейным арганізмам, які жыве самастойным ідэйным і практычным жыццём, а чымсьці накшталт сістэмы ўстаноў, ніжэйшых, сярэдніх і вышэйшых». Таварыш Сталін указваў тады на тое, што барацьба з такімі поглядамі з'яўляецца чарговай задачай партыі. Гэтыя ўказанні таварыша Сталіна неабходна напомніць у сувязі з фактамі бюракратычных скажэнняў прынцыпаў дэмакратычнага цэнтралізма.

Аб вядомым адрыве кіруючых работнікаў ад партыйнага жыцця гаварыў тут рад таварышоў і асабліва пераканальна тав. Хатаевіч.

Тав. Хатаевіч на вопыце дніпрапетроўскай арганізацыі паказаў, як захапленне гаспадарчай пякучкай прывозіць да страты густу да партработы, да паслаблення партработы. Такое становішча з'яўляецца тыповым. Трэба вапомніць, што, загружаючы сябе дробнымі гаспадарчымі справамі на шкоду партрабоце, мы забываемся, што партыйную работу за нас ніхто весці не будзе. Кіраўніцтва партработай — галоўная функцыя партработнікаў, адказнасць за яе становішча цалкам і поўнасцю ляжыць на іх.

Прамова тав. Кабакова была паказальнікам таго, што партыйная работа вельмі сур'ёзна забыта ў радзе арганізацый. Тав. Кабакоў гаварыў аб усім, апрача партработы. Гаварыў аб кіномеханіцы, аб матэрыяльнай частцы кіно, аб радыё. Усё гэта—вельмі важныя і вельмі істотныя рэчы. Але калі было пастаўлена тав. Молатавым перад тав. Кабаковым пытанне, як абстаіць справа з кааптацыяй на Урале, ён абышоў гэта пытанне. Стала быць, пытанні партработы не з'яўляюцца асноўнымі для тав. Кабакова. Гэта паказвае, што недаацэнка партработы не пераможана, што неабходны пералом у гэтых адносінах яшчэ не створан і што пачынаць трэба з кіраўнікоў. Паварот да партыйнай работы цалкам залежыць ад павароту кіраўніцтва партыйных арганізацый.

Некалькі слоў адносна паралку выбараў. Тут таварышы гаварылі аб тым, што неабходна даць указанні, як правесці тайнае галасаванне: ці будзе «скварэшніца», або шары качаць. Гэта справа вельмі істотная, але цяпер нам трэба мець не інструкцыю, а трэба ведаць, ці ўхваляецца прынцып. Супроць прынцыпа тайнага галасавання тут ніхто не пярэчыў, наадварот, таварышы падкрэслівалі выключную важнасць і істотнае значэнне тайнага галасавання для забеспячэння сапраўднай свабоды выбараў. Сам працэс выбараў будзе, відавочна, падзелен на дзве стадыі. Першая стадыя, калі ідзе зусім адкрытае абмеркаванне кандыдатур. Кожны мае права называць і адстойваць кожную кандыдатуру ў абіраемы партыйны камітэт. Гэта першая стадыя. Затым абмеркаваныя кандыдатуры гасаюцца шляхам закрытага галасавання.

Можна ўзяць, як узор і прыклад, практыку выбараў ЦК на партыйных з'ездах, дзе выбары праводзяцца тайным галасаваннем. Я думаю, што гэта практыка можа быць цалкам і поўнасцю скарыстана мясцовымі партыйнымі арганізацыямі.

Цяпер адносна кааптацыі. Некаторыя таварышы ўказваюць, што расцвіт ранае прымяненне кааптацыі звязана тым, што прыходзіцца перамяшчаць с кратароў і іншых адказных партыйных кіраўнікоў і ў сілу гэтага ўводзіць іх тэй або іншы партыйны камітэт. Калі нас выбары партыйных арганізацый будуць адбывацца ў дакладна ўстаноўлены тэрміны, то не будзе няжкасцей ад таг што чалавек два-тры месяцы не будзе а раны. Ён будзе выконваць абавязкі с кратара, але не будзе членам партыйнага камітэта, а на надыходзячай канферэнцыі можа быць абраны ў партыйны камітэ У нас пяпер бывае, што членам партыйнага камітэта парткіраўнік становіцца а начасова з атрыманнем таго або іншаг партыйнага паста. Гэта зусім не абавя кова. Ён будзе да канферэнцыі выконва абавязкі сакратара, не будучы члена партыйнага камітэта.

Наступная заўвага. У нас кааптацыя вядомай меры была звязана з пякучасц кадраў, з частай пераклікай работнікаў.

Выступаўшыя таварышы гаварылі тут а «беднасці» кадрамі, якая, нібыта, прымушае іх рабіць пастаянныя перагрупоўкі перакідкі людзей. Яны забываюць, шт рэзерваў і магчымасцей у нас для вылу чэння новых кадраў выключна многа. В паглядзіце, як хутка ў нас растуць па тыйныя і беспартыйныя людзі, паглядзіц на рост стаханаўцаў, ды і не толькі ста ханаўцаў. А возьміце рух жонак камандз раў Чырвонай Арміі і работнікаў прамы словасці, успомніце нядаўнія ўсесаюзны нарады. У сэнсе яркасці, сочнасці, поўна пэннасці іх выступленняў, у сэнсе выбо ру новых форм і новых метадаў агітацы па багацню тэм, зместу і формы прамоў многія з іх, чэснае слова, заткнуць з пояс іншых прысяжных і паліняўшых на шых агітатараў. Людзей вакол нас маса людзей вельмі многа, такіх людзей, які даўно ўжо чакаюць вылучэння, але мы і не бачым у сілу недахвату дэмакратызм у нас, недахвату, які перашкаджае на бачыць новых людзей, і шмат якія люд ў нас перастойваюць, а перастойваючы будучы забытымі, яны становяцца рэзер вам пездаволеных умутры нашай партыі З гэтага пункту гледжання пераход д тайнага галасавання, пераход да сапраўд най выбарнасці нашых партыйных арга нізацый дапаможа нам узняць велізарн рэзерв партыйных кадраў, які ёсць у нас Яшчэ Ленін гаварыў у часы, калі ў на кадраў работнікаў было сапраўды мала што трэба караць тых, якія гавораць што ў нас мала кадраў.

Некалькі слоў аб агітацыі. Тут пра вільна гаварылі таварышы, што наш агітацыя захватвае, галоўным чынам, пе радавых рабочых, асобныя калгасы. Ян зусім не ахватвае велізарных слаёў лю дзей, якія гатовы нам дапамагчы, ва ўсяк які час гатовы адгукнуцца і быць нашым прыяцелямі, непартыйнымі большэвікамі Я маю на ўвазе тут інтэлігенцыю, слу жачых, хатніх гаспадынь, ды і не толь іх. Трэба прама сказаць, што агітацый най работай мы не ахватваем нават усіх рабочых на буйных прадпрыемствах, а ў вёсцы працуем толькі ў частны калгасаў. У нас ёсць калгасы, у якіх раённыя работнікі бываюць разы два-тры ў год, а ёсць шмат калгасаў, большай часткі слабых — і ў гэтым галоўная небяспека, — глухіх куткоў, аб якіх гаварыў тав. Эйхе, у якія ніхто не заязджае, бо на іх махнулі рукой. Гэта абсалютна няправільна. Трэба ўзмоцнена працаваць якраз з тымі рабочымі, калгаснікамі, служачымі і іншымі працоўнымі, якія яшчэ недастаткова ахвачаны нашым палітычным уплывам.

Змест нашай агітацыі зачастую не адказвае крама і адкрыта на пастаўленыя рабочымі пытанні. У сувязі з кожным напым мерапрыемствам мы атрымліваем масу запытанняў і водгукаў, у партыйных камітэтах складаюць спісы гатых пытанняў, але па гэтыя запытанні часта не адказваюць, унікаюць адказваць на цяжкія пытанні. Гэта няправільна, наша агітацыя павінна быць праўдзівай, наша агітацыя павінна адказваць па ўсе пытанні рабочых і не пакідаць іх без увагі, без адказу, бо, калі мы не адкажам, то за нас хто-небудзь адкажа, — «свято место пусто не бывает».

І, нарэшце, пытанне аб нашых агіткалектывах, работа якіх знаходзіцца ў вялікім загоне і закідзе. Яны таксама абслугоўваюць галоўным чынам фабрычна-заводскія прадпрыемствы. А што датычыць агітатараў, якія-б працавалі на жактах, па ВНУ і ВТНУ, сярод служачых і інтэлігенцыі, — сюды нашы партарганізацыі яшчэ не дайшлі. Неабходна набыць і гэтыя кадры людзей. Магчымасці ў нас тут выключныя. Усё ў нашых руках знаходзіцца: і радыё, і кіно, і газеты, і чорт велае колькі сродкаў агітацыі!

Ці скарыстоўваем мы гэтыя сродкі? Зусім недастаткова. Пытанне ідзе аб тым, каб наладзіць гэту работу, і гэта — вельмі сур'ёзная справа.

РЭВОЛЮЦЫЯ Ў РАСІІ І ЗАДАЧЫ РАБОЧЫХ УСІХ КРАІН

(З артыкула В. І. ЛЕНІНА)

Таварышы рабочыя!

Прадбачанне тых соцыялістаў, якія таліся верны соцыялізму і не паддаліся чаду дзікага, зверскага ваеннага істэрыі, апраўдалася. Першая рэвалюцыя, пароджаная сусветнай разбойніцкай вайной паміж капіталістамі розных краін, разразілася. Імперыялісцкая вайна, гэта значыць вайна з-за дзеляжу награбленай здабычы паміж капіталістамі, з-за ўціскання слабых народаў, пачала ператварацца ў грамадзянскую вайну, гэта значыць вайну рабочых супроць капіталістаў, вайну працоўных і прыгнечаных супроць сваіх прыгнятальнікаў, супроць цароў і каралёў, супроць памешчыкаў і капіталістаў, вайну за поўнае вызваленне чалавецтва ад войн, ад ганьбы мас, ад прыгнечання чалавека чалавекам!

Рускім рабочым выпаў на долю гонар першасце першым пачаць рэвалюцыю, якая значыць вялікую, адзіна законную і справядлівую вайну прыгнечаных супроць прыгнятальнікаў.

Пецербургскія рабочыя перамаглі царскую манархію. У геройскай барацьбе супроць паліцыі і царскіх войск, чаўшы бяззбройнымі паўстанне супроць кулямётаў, рабочыя прыцягнулі на свой бок большую частку салдат пецербургскага гарнізона. Тое-ж адбылося ў Маскве і іншых гарадах. Пакінуты сваімі войскамі, цар павінен быў здацца: ён падпісаў адрачэнне ад прастола за сябе, і за свайго сына. Ён прапанаваў перадаць прастол свайму брату Міхаілу.

Дзякуючы велізарнай хуткасці пераходу, дзякуючы прамой данамозе англа-французскіх капіталістаў, дзякуючы недастатковай свядомасці ўсёй рабочай і народнай масы ў Пецербургу, дзякуючы арганізаванасці і падрыхтаванасці рускіх памешчыкаў і капіталістаў, яны захапілі дзяржаўную ўладу ў свае рукі. У новым рускім урадзе, часовым урадзе», важнейшыя месцы— старшынства, міністэрства ўнутраных спраў і ваеннае дасталіся Львову і Гучкову, акцябрыстам, якія ўсімі сваімі сіламі дапамагалі Нікалаю Крываваму і Распуціну-вешацелю душыць рэвалюцыю 1905 года, расстрэльваць і вешаць рабочых і сялян, якія змагаліся за зямлю і волю. Менш важныя міністэрствы дасталіся кадэтам: замежных спраў — Мілюкову, народнай асветы— Шынгарову, земляробства—Шынгарову. Адно зусім няважнае мясцечка, міністэрства юстыцыі, далі працавіку Керанскаму, краснабаю, які патрэбен капіталістам, каб супакойваць народ пустымі абяцаннямі, адурачваць яго гучнымі фразамі, «прымірацъ» яго з памешчыкам і капіталістычным урадам, які жадае працягваць разбойніцкую вайну ў саюзе з капіталістамі Англіі і Францыі, вайну за захват Арменіі, Канстанцінопаля, Галіцыі, вайну за тое, каб англа-французскія капіталісты ўтрымалі ў сваіх руках тую здабычу, якую яны адабралі ў капіталістаў нямецкіх (усе калоніі немцаў у Афрыцы), і ў той-жа час адабралі ў нямецкіх капіталістаў здабычу, захвачаную гэтымі разбойнікамі (частку Францыі, Бельгію, Сербію, Румынію і інш.).

Разумеецца, рабочыя не маглі давяраць такому ўраду.

Рабочыя скідалі царскую манархію, змагаючыся за мір, за хлеб і за свабоду. Рабочыя адразу адчулі, чаму Гучкову, Мілюкову і К° ўдалося здабраць перамогу ў рабочага народу? Таму, што рускія памешчыкі і капіталісты былі добра падрыхтаваны і арганізаваны; таму, што на іх баку сіла капітала, багацце і рускіх капіталістаў і самых багатых ва ўсім свеце капіталістаў англійскіх і французскіх. Рабочыя адразу зразумелі, што для барацьбы за мір, за хлеб і за свабоду працоўныя класы, рабочыя, салдаты і сяляне, павінны арганізавацца, згуртавацца, аб'яднацца асобна ад капіталістаў і супроць іх. І пецербургскія рабочыя, перамогшы царскую манархію, зараз-жа стварылі сваю арганізацыю, совет рабочых дэпутатаў, зараз-жа прыняліся ўмацоўваць і расшыраць яе, ствараць самастойныя советы салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

Праз некалькі ўжо дзён пасля рэвалюцыі пецербургскі совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў налічваў звыш 1.500 дэпутатаў ад рабочых і ад сялян, адзетых у салдацкія мундзіры. Гэты совет карыстаўся такім давер'ем чыгуначных служачых і ўсёй масы працоўнага насельніцтва, што ён стаў ператварацца ў сапраўдны народны ўрад.

І нават самыя верныя прыхільнікі і апекуны Гучкова — Мілюкова, самыя верныя вартавыя сабакі англа-французскага разбойніцкага капітала, Роберт Вільсон, супрацоўнік багацейшай газеты англійскіх капіталістаў «Таймс» (The Times) і Шарль Рывэ, супрацоўнік багацейшай газеты французскіх капіталістаў «Тан» (Le Temps), нават яны, асцерагаючы шалёнай лаянкай совет рабочых дэпутатаў, усё-такі вымушаны былі прызнаць, што ў Расіі два ўрады. Адзін «усімі» прызнаны (гэта значыць на справе ўсімі багатымі людзьмі прызнаны) урад памешчыкаў і капіталістаў, Гучковых і Мілюковых. Другі «нікім» (з багатых класаў) не прызнаны, урад рабочых і сялян: пецербургскі Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які імкнецца ва ўсёй Расіі ўстанавіць советы рабочых і советы сялянскіх дэпутатаў. (Ленін. Том XX, стар. 48—50).

ЛЮТАЎСКАЯ БУРЖУАЗНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ. НА РЫСУНКУ: узяцце Літоўскага замка ў Петраградзе. Рыс. В. Шчаглова.

ТЭЛЕГРАМА ЦАРА ГЕНЕРАЛУ ХАБАЛАВУ

25 ЛЮТАГА 1917 ГОДА.

Загадваю заўтра-ж спыніць у сталіцы беспарадкі, недапушчальныя ў цяжкі час вайны з Германіяй і Аўстрыяй.

(Музей Рэвалюцыі, Масква). Нікалай II.

ТЭЛЕГРАМА ген. ХАБАЛАВА ген. АЛЕКСЕЕВУ

27 ЛЮТАГА 1917 г.*).

Падана 27.II, 20 г. 10 м.

Прынята 28.II, 0 г. 55 м.

Прашу далажыць яго імператарскай вялікасці, што выканаць загад аб адноўленні парадку ў сталіцы не мог. Большасць часцей адны за другімі здрадзілі свайму доўгу, адмаўляючыся біцца супроць мяцежнікаў. Другія часці набраталіся з мяцежнікамі і абярнулі сваю зброю супроць верных яго вялікасці войск. Астаўшыяся вернымі доўгу ўвесь дзень змагаліся супроць мяцежнікаў, панёсшы вялікія страты. К вечару мяцежнікі аўладалі большай часткай сталіцы. Вернымі прысязе астаюцца невялікія часці розных палкоў, сцягнутыя ля Зімняга палаца пад начальствам генерал-маёра Занкевіча, з якімі буду прадаўжаць барацьбу.

Генерал-лейтэнант Хабалаў.

*) На арыгінале паметка рукой ген. Алексеева: «28.II.917.I г.». Журнал «Красный архив» № 21, стар. 15—16.

ТЭЛЕГРАМА РАДЗЯНКА ЦАРУ

27 ЛЮТАГА 1917 г.

Падана 27.II, 12 г. 40 м.

Прынята 27.II, 13 г. 5 м.

Заняткі дзяржаўнай Думы ўказам вашай вялікасці спынены да красавіка. Апошні аплот парадку адхілен. Урад зусім бяссільны падавіць беспарадак. На войскі гарнізона надзеі няма. Запасныя батальёны гвардзейскіх палкоў ахвачаны бунтам. Забіваюць афіцэраў. Далучыўшыся да натоўпу і народнага руху, яны накіроўваюцца да дома міністэрства ўнутраных спраў і дзяржаўнай Думы. Грамадзянская вайна пачалася і разгараецца. Загадайце неадкладна прызваць новую ўладу на пачатках даложаных мною вашай вялікасці ва ўчарашняй тэлеграме. Загадайце ў адмену вашага найвышэйшага загаду зноў склікаць законадаўчыя палаты. Абвясціце неадкладна гэтыя меры найвышэйшым маніфестам. Гасудар, не марудзьце. Калі рух перакінецца ў армію, затрымфуе немец, і крушэнне Расіі, а з ёй і дынастыі неміннуча. Ад імя ўсёй Расіі прашу вашу вялікасць аб выкананні даложанага. Гадзіна, якая рашае лёс ваш і радзімы, настала. Заўтра можа ўжо быць позна.

Старшыня Дзяржаўнай Думы Радзянка.

Журнал «Кр. архив» ст. 5—6 № 21.

АД ШТАБА ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА АРМІЯМІ ЗАХОДНЯГА ФРОНТА

Начальнікам Штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага атрыманы весткі аб тым, што з Вялікіх Лук на Полацк едзе дэпутацыя ў 50 чалавек, нібы ад Новага ўрада абязбройвае жандараў. Па азначанаму пытанню быў запытан Старшыня Дзяржаўнай Думы Радзянка, які, аднак, паведаміў, што ніякіх дэпутатаў не пасылалася.

Такім чынам, відаць, пачынаюць з'яўляцца ўжо чыста рэвалюцыйныя, разнузданыя шайкі, якія імкнуцца раззброіць жандараў на чыгунках, а ў далейшым будуць імкнуцца захапіць уладу як на чыгунках, так і ў тылу арміі, і, напэўна, папрабуюць пранікнуць і ў самую армію.

Супроць такіх злачынных асоб прымаюцца самыя энергічныя меры, прычым, пры з'яўленні дзе-небудзь падобных самазваных дэлегацый, такавыя будуць затрымліваемы і аддаваемы суду.

(«Минский голос» № 2367, 4/III 1917 г. стр. 1).

І. СТАЛІН

АБ УМОВАХ ПЕРАМОГІ РУСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Рэволюцыя ідзе. Выбухнуўшы ў Петраградзе, яна перакідваецца ў правінцыю, захватваючы паступова ўсю неабсяжную Расію. Больш тато. Ад пытанняў палітычных яна неміннуча пераходзіць да пытанняў соцыяльных, да пытанняў наладжвання быту рабочых і сялян, паглыбляючы і абвастраючы перажываемы крызіс.

Усё гэта не можа не выклікаць трывогі ў пэўных колах уладарніцкай Расіі. Уздымае галаву царысцка-памешчыцкая рэакцыя. Б'е ў набат імпэрыялістычная кліка. Фінансавая буржуазія працягвае руку аджываючай феадальнай арыстакратыі для сумеснай арганізацыі контррэволюцыі. Сёння яны яшчэ слабы і нерашучы, але заўтра яны могуць узмацнець і мабілізавацца супроць рэволюцыі. Ва ўсякім выпадку сваю чорную работу яны вядуць нястомна, збіраючы сілы ва ўсіх пластах насельніцтва, не выключаючы армію...

Як утамаваць пачынаючуюся контррэволюцыю?

Якавы ўмовы, неабходныя для перамогі рускай рэволюцыі?

Адна з асаблівасцей нашай рэволюцыі складаецца з таго, што базай яе да гэтага часу з'яўляецца Петраград. Сутычкі і выстралы, барыкады і афяры, барацьба і перамога мелі месца галоўным чынам у Петраградзе і яго ваколіцах (Кранштат і інш.). Правінцыя абмежавалася ўспрыманнем плядоў перамогі і выражэннем давер'я Часоваму Ўраду.

Адлюстраваннем гэтага факта з'явілася тое двоеўладства, той фактычны раздзел улады паміж Часовым Урадам і Петраградскім Советам Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, які не дае спакою наемнікам контррэволюцыі. Петраградскі Совет Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, як орган рэволюцыйнай барацьбы рабочых і салдат, і Часовы Ўрад, як орган напалоханай «крайнаспямі» рэволюцыі ўмеранай буржуазіі, знайшоўшай сабе апору ў інертнасці правінцыі — такі малюнак.

У гэтым — слабасць рэволюцыі, бо падобнае становішча рэчаў замацоўвае адарванасць правінцыі ад сталіцы, адсутнасць кантакту паміж імі.

Але з паглыбленнем рэволюцыі рэволюцыянізуецца і правінцыя. Арганізуюцца на месцах Советы Рабочых Дэпутатаў. Уцягваюцца ў рух сяляне і арганізуюцца ў свае саюзы. Дэмакратызуецца армія і арганізуюцца на месцах саюзы салдат. Інертнасць правінцыі адыходзіць у мінулае.

Тым самым хістаецца глеба пад нагамі Часовага Ўрада.

Разам з тым і Петраградскі Совет Рабочых Дэпутатаў становіцца недастатковым для новага становішча.

Неабходны агульнарасійскі орган рэволюцыйнай барацьбы ўсёй расійскай дэмакратыі, дастаткова аўтарытэтны для таго, каб спаяць у адно сталічную і правінцыяльную дэмакратыю і з органа рэволюцыйнай барацьбы народу ператварыцца ў патрэбны момант у орган рэволюцыйнай улады, якая мабілізуе ўсе жывыя сілы народу супроць контррэволюцыі.

Такім органам можа быць толькі Ўсерасійскі Совет Рабочых, Салдацкіх і Сялянскіх Дэпутатаў.

Такая першая ўмова перамогі рускай рэволюцыі.

Далей. Вайна, як усё ў жыцці, апрача алмоўных бакоў, мае яшчэ той станоўчы бок, што яна, мабілізаваўшы амаль усё дарослае насельніцтва Расіі, зрабіла армію народнай па духу і тым аблегчыла справу аб'яднання салдат з паўстаўшымі рабочымі. Гэтым менавіта і тлумачыцца тая параўнаўчая лёгкасць, з якой выбухнула і перамагла ў нас рэволюцыя.

Але армія рухома і пякуча, асабліва з прычыны яе пастаяннага перасоўвання з аднаго месца ў другое ў сувязі з патрэбнасцямі вайны. Армія не можа стаяць вечна на адным месцы, абараняючы рэволюцыю ад контррэволюцыі. Таму патрэбна другая ўзброеная сіла, армія ўзброеных рабочых, натуральна звязаных з цэнтрамі рэволюцыйнага руху. І калі верна палажэнне, што рэволюцыя не можа перамагчы без узброенай сілы, заўсёды гатовай да яе паслуг, то і наша рэволюцыя не абыдзецца без сваёй уласнай рабочай гвардыі, кроўна звязанай з інтарэсамі рэволюцыі.

Неадкладнае ўзбраенне рабочых, рабочая гвардыя — такая другая ўмова перамогі рэволюцыі.

Характэрнай рысай рэволюцыйных рухаў, напрыклад, ва Францыі, з'яўляецца той несумненны факт, што там Часовыя Ўрады звычайна ўзнікалі на барыкадах і, з прычыны гэтага, з'яўляліся рэволюцыйнымі, ва ўсякім выпадку больш рэволюцыйнымі, чым скліканымі імі пасля ўстаноўчыя сходы, якія склікаліся звычайна пасля супакаення краіны. Гэтым уласна і тлумачыцца, што найбольш вопытныя рэволюцыянеры тых часоў стараліся ажыццявіць сваю праграму яшчэ да склікання Устаноўчага Схода, пры дапамозе рэволюцыйнага ўрада, адцягваючы гэта скліканне. Гэтым яны хацелі паставіць Устаноўчы Сход перад фактам ужо ажыццёўленых рэформ.

Не тое ў нас. Часовы Ўрад узнік у нас не на барыкадах, а каля барыкад. Таму ён і не рэволюцыйны, — ён толькі ляцеціца за рэволюцыяй, упіраючыся і блытаючыся ў нагах.

І калі меркаваць па таму, як крок за крокам паглыбляецца рэволюцыя, высоўваючы соцыяльныя пытанні аб 8-гадзінным рабочым дні і канфіскацыі зямель, рэволюцыянізуючы правінцыю,—то можна з упэўненасцю сказаць, што будучы Ўсенародны Устаноўчы Сход будзе многа дэмакратычней цяперашняга Часовага Ўрада, абранага 3-е-чэрвеньскай Думай.

Разам з тым можна апасацца, што Часовы Ўрад, запалоханы размахам рэволюцыі і прасякнуты імперыялістычнымі тэндэнцыямі, можа паслужыць пры пэўнай палітычнай кан'юнктуры «законным» шчытом і прыкрыццем арганізуючайся контррэволюцыі.

Таму ні ў якім выпадку не трэба адцягваць скліканне Устаноўчага Схода.

Таму неабходна магчыма хуткае скліканне Устаноўчага Схода, адзіна аўтарытэтнай для ўсіх пластоў грамадства ўстановы, якая можа ўвянчаць справу рэволюцыі і тым абрэзаць крылы падымаючайся контррэволюцыі.

Хуткае скліканне Устаноўчага Схода— такая трэцяя ўмова перамогі рэволюцыі.

Усё гэта пры агульнай ўмове хутчэйшага адкрыцця мірных перагавораў, пры ўмове спынення бесчалавечнай вайны, бо працяглая вайна з яе вынікамі фінансавага, гаспадарчага і харчовага крызіса з'яўляецца тым падводным камнем, аб які можа разбіцца карабль рэволюцыі.

(«Правда» № 12, 18 (31) сакавіка 1917 г., за подпісам К. Сталін).

(Пераклад А. ДАБРАВОЛЬСКАГА).

Н. РОНІС

ЗВЯРЖЭННЕ ЦАРЫЗМА

(Да 20-годдзя лютаўскай рэволюцыі 1917 г.)

Дваццаць год назад пад ударамі рэволюцыйнага рабочага класа і сялянства разляцелася ўпрах царская манархія, якая была турмой народаў, «ачагом усякага розду гнёту — і капіталістычнага, і каланіяльнага і ваеннага, — узятага ў яго найбольш бесчалавечай і варварскай форме» (І. Сталін. «Пытанні ленінізма», выд. X, стар. 4).

Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі адбылася першая буржуазная дэмакратычная рэволюцыя ў Расіі ў 1905 — 1907 гг., якая патрасла ўстоі самадзяржаўнага ладу да самых асноў. Але, не гледзячы на гераічную барацьбу рабочага класа, не гледзячы на рэволюцыйныя выступленні сялянства, не гледзячы на разгарнуўшуюся нацыянальна-вызваленчую барацьбу прыгнечаных народаў рэволюцыя пацярпела тады паражэнне, і царская манархія ўстаяла.

Аднак гэта перамога царызма была неўгавечнай. Рабочы клас у першай схватцы з царызмам быў разбіт, але не пераможан, яго рэволюцыйны дух не быў зломан. Пролетарыят верыў у неміннасць сваёй перамогі, большэвікі кіравалі рэволюцыйнай барацьбой мас. У Расіі быстра нарастала новая рэволюцыя. Рэволюцыйныя масы вёў рабочы клас на чале са сваёй большэвіцкай партыяй.

Сусветная імперыялістычная вайна 1914 г. часова прарвала пачаўшыяся рэволюцыйны ўздым. На рабочы клас і большэвіцкую партыю абрушыліся рэпрэсіі царскага ўрада. Большэвіцкая соцыял-дэмакратычная фракцыя ў дзяржаўнай думе была арыштавана, асуджана і адпраўлена ў ссылку. Газета рабочых «Правда» была закрыта. Профсаюзы разгромлены. Лепшыя партыйныя работнікі арыштаваны. Але, не гледзячы на гэтыя рэпрэсіі і праследванні, большэвіцкая партыя працягвала сваю рэволюцыйную работу. Мутнаму патоку соцыял-шавінізма яна проціпаставіла сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма. Большэвікі высунулі рэволюцыйныя лозунгі: ператварэнне імперыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую і паражэнне царскай манархіі. Супроць гэтых ленінскіх лозунгаў выступалі ворагі народу — Іўда-Троцкі, Пятакоў і Бухарын. Яны абаранялі меншавіцкі лозунг «барацьба за мір» і не ставілі пытанне аб рэволюцыйным звяржэнні царызма. Яшчэ ў лютым 1914 г. на судзе над большэвіцкай фракцыяй IV дзяржаўнай думы Каменеў, будучы сведкай, па-прадажніцку, па-здрадніцку адмаўляўся ад большэвіцкіх рэволюцыйных лозунгаў і салідарызаваўся з абаронцамі. Гэтыя ганебныя паводзіны Каменева былі Леніным публічна асуджаны, як недастойныя звання члена партыі.

Хвалі народнага гневу, абурэння, выкліканага імперыялістычнай вайной і насоўваючымся голадам, раслі з надзвычайнай быстратой. На чале новага рэволюцыйнага крызіса стаяў рабочы клас, якім кіравала большэвіцкая партыя. Большэвікі былі адзінай партыяй, якая змагалася за рэволюцыю. І колькі ні стараліся царскія жандары, ім не ўдалося разбурыць большэвіцкую партыю. Правадыр большэвік Ленін накіроўваў работу партыйных арганізацый. Ленінскія дырэктывы ператвараліся большэвікамі ў жыццё. Кіраўніцтва партыйнымі арганізацыямі ажыццяўлялі лепшыя работнікі большэвіцкай партыі — таварышы: Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Кіраў, Куйбышэў. Усямерную дапамогу ў кіраўніцтве партыйнымі арганізацыямі ў Расіі аказвалі таварышы Сталін і Свердлоў, якія знаходзіліся ў Сібірскай ссылцы, і таварыш Орджанікідзе, які адбываў катаргу.

У Расіі не было ні аднаго буйнага горада, прамысловага цэнтра, ні адной буйнай фабрыкі і завода, дзе-б не было партыйнага камітэта, групы, ячэйкі большэвіцкай партыі.

Растучае абурэнне рабочых палітыкай «вайны да пераможнага канца» перадавалася сялянскім масам і армії. Вайна разарала сялянскую гаспадарку. У вёсцы нарастаў рэволюцыйны крызіс. За гады вайны па няпоўных вестках дэпартамента паліцыі было адзначана каля 176 сялянскіх выступленняў. Сялянская беднота падымалася супроць памешчыцкай і кулацкай кабалы.

Рэволюцыйная барацьба рабочых і сялян супроць царскай манархіі дапаўнялася і падмацоўвалася нацыянальна-вызваленчай барацьбой прыгнечаных народаў. У 1916 г. у Сярэдняй Азіі, на тэрыторыі цяперашніх Совецкіх Узбекскай, Таджыкскай, Туркменскай, Казахскай і Кіргізскай рэспублік, успыхнула нацыянальна-вызваленчае рэволюцыйнае паўстанне, якое царскімі каланізатарамі было падаўлена з нечуванай жорсткасцю: дзесяткі тысяч людзей былі забіты, тысячы кішлакоў і аулаў спалены.

Зліліся тры патокі рэволюцыйнай барацьбы супроць царызма: барацьба рабочых, сялянскі рух і нацыянальна-вызваленчыя паўстанні. На чале ўсёй гэтай народнай барацьбы з царызмам стаяла большэвіцкая партыя. Яна вяла працоўныя масы да рашучага штурму цвярдыні царскай манархіі.

Большэвікам у барацьбе за рэволюцыю давялося выкрываць антырэволюцыйную пазіцыю меншавікоў, эсэраў. Гэтыя ворагі народу хапелі перамогі буржуазіі над царызмам для вядзення вайны з Германіяй да пераможнага канца. Яны (у тым ліку і Троцкі) дэзарганізавалі рэволюцыйную барацьбу рабочых. Яны звалі рабочых яднацца вакол буржуазных партый дзяржаўнай думы. Яны змагаліся супроць уцягвання ў рэволюцыйны рух сялянства і арміі. «Троцкі, — пісаў Ленін, — на справе дапамагае ліберальным рабочым палітыкам Расіі, якія пад «адмаўленнем» ролі сялянства разумеюць нежаданне ўзнімаць сялян на рэволюцыю». (Ленін. Збор твораў. Т. XVIII, стар. 318). Троцкі, гэты прэзрэнны вораг народу, подлы забойца, агент фашызма, выступаў тады разам з соцыял-шавіністамі супроць перамогі рэволюцыйнага пролетарыята над царызмам, супроць перамогі соцыялізма ў нашай краіне.

Для большэвікоў буржуазна-дэмакратычная рэволюцыя ў Расіі была толькі першым этапам к рэволюцыі соцыялістычнай. Для Леніна буржуазна-дэмакратычная рэволюцыя, якой кіраваў рабочы клас, павінна была неадкладна перарастаць у соцыялістычную рэволюцыю. Буржуазна-дэмакратычную і соцыялістычную рэволюцыі большэвікі разглядалі як «два звяны аднаго ланцуга, як адзіны і цэльны малюнак размаху рускай рэволюцыі» (Сталін. «Пытанні ленінізма», выд. X. стар. 20). Гэту ленінскую пастаноўку пытання імкнуўся ў 1926 г. жаньбіць Каменеў. Гэты здраднік Кастрычніка, які дакаціўся ўрэшце да ролі подлага трацкісцкага забойцы, ворага народу, фашысцкага агента, даказваў, быццам Ленін у гады сусветнай імперыялістычнай вайны задачы рускага пролетарыята абмяжоўваў рамкамі буржуазнай рэволюцыі. Гэта хлусня патрэбна была Каменеву ў яго варожых партыі мэтах, таму, што Каменеў быў праціўнікам соцыялістычнай рэволюцыі, ён па-трацкісцку адмаўляў магчымасць перамогі соцыялізма ў адной асобна ўзятай краіне. Гэтай подлай і бяспрыкладнай фальсіфікацыі ленінізма з боку ворага большэвікоў Каменева бязлітасны адпор даў таварыш Сталін. У сваім заключным слове на XV партыйнай канферэнцыі таварыш Сталін гаварыў: «Каменеў заявіў у сваёй прамове, што асноўнае палажэнне Леніна ў яго артыкуле ад 1915 г. (артыкул «Аб лозунгу Злучаных Штатаў Еўропы». Рэд.), палажэнне, якое вызначыла ўсю лінію нашай рэволюцыі і нашага будаўніцтва, што гэта палажэнне, якое гаворыць аб магчымасці перамогі соцыялізма ў адной краіне, не датычыць і не можа датычыць Расіі, што Ленін, гаворачы аб магчымасці перамогі соцыялізма ў адной краіне, меў на ўвазе не Расію, а толькі іншыя капіталістычныя краіны. Гэта непраўдападобна і жудасна. Гэта вельмі падобна на прамую хлусню на Леніна, але Каменеву няма справы да гэтага. Ён клапоціцца толькі аб адным: прачысціць дарогу Троцкаму ўсякай цаной» (стэнаграфічная справаздача XV партканферэнцыі, стар. 730, ГИЗ 1927 г.). Большэвікі ў 1915 г., як і ў 1905 г., разглядалі перамогу буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі, як першы этап «... для таго, каб перайсці адразу-ж да другога не этапа, к рэволюцыі соцыялістычнай. (Там-жа, стар. 732). І толькі прэзрэнныя здраднікі, прадажнікі, ворагі соцыялістычнай рэволюцыі і соцыялізма Каменевы і Троцкія ўкупе з меншавікамі і эсэрамі імкнуліся абмежаваць задачы пролетарыята дваццатым пераваротам, замест аднаго пара пасадзіць другога.

Буржуазная рэволюцыя ў Расіі была зроблена супроць волі буржуазіі. Рухаючымі сіламі лютаўскай рэволюцыі 1917 г. былі рабочыя і сяляне (апранутыя ў салдацкія шынелі). На чале рэволюцыйнай барацьбы супроць царскага ўрада ішоў петраградскі пролетарыят. Ужо 9 стыхэня 1917 г. па закліку пецербургскага камітэта большэвікоў у палітычнай стачцы-пратэсту прымалі ўдзел 137.538 рабочых. І калі 25 лютага ў Петраградзе адбылася падрыхтаваная большэвікамі ўсеагульная стачка, яна з гістарычнай неміннасцю ператварылася ва ўзброенае паўстанне супроць царскага самадзяржаўя. Трымаўшаяся 300 год на крыві, на катаваннях і пакутах народу раманаўская манархія, гэты аплот усякай і ўсялякай рэакцыі, была змецена.

На чале жалезнай когорты пролетарскіх байцоў ішла, загартаваная ў барацьбе з ворагамі народу, слаўная партыя большэвікоў, якой кіравалі Ленін і Сталін. «Наша партыя, — пісаў Ленін пры першых вестках аб рэволюцыі, — аказалася з масамі, з рэволюцыйным пролетарыятам, не гледзячы на арышты і ссылку ў Сібір яшчэ ў 1914 годзе нашых дэпутатаў, не гледзячы на адчайныя праследванні і арышты, якія падвяргаўся Пецербургскі Камітэт за сваю нелегальную работу ў часе вайны супроць вайны і супроць палрызма». (Ленін. Збор твораў. т. XX, стар. 25).

У агні рэволюцыі нарадзіліся баявыя органы рэволюцыі — Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Таварыш Сталін, які прыбыў у сакавіку 1917 г. з ссылкі ў Петраград, пісаў: «Залог канчатковай перамогі рускай рэволюцыі — ва ўмацаванні саюза рэволюцыйнага рабочага з рэволюцыйным салдатам.

Органамі гэтага саюза з'яўляюцца Советы рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

І чым шчыльней згуртаваны гэтыя Советы, чым мацней яны арганізаваны, тым сапраўдней выражаная ў іх рэволюцыйная ўлада рэволюцыйнага народу, тым рэальней гарантыі супроць контррэволюцыі». (І. Сталін. «На шляхах к Кастрычніку», 2-е выд., стар. 2, 1925 г.).

Але пролетарыят, паслаблены вайной, праданы партыямі меншавікоў і эсэраў, не быў у стане адзін захапіць усю ўладу ў свае рукі. Побач з Советамі пры салдэйшчыні прадажнікаў рэволюцыі — меншавікоў і эсэраў узнік буржуазны Часовы ўрад. У краіне ўстанавілася двоеўладства. «Лютаўска-сакавіцкая рэволюцыя, — пісаў Ленін, — была толькі першым этапам рэволюцыі. Расія перажывае своеасаблівы гістарычны момант пераходу да наступнага этапа рэволюцыі...» (Ленін. Збор твораў. Т. XX, стар. 32). І пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў, пад кіраўніцтвам вялікіх правадыроў пролетарыята Леніна і Сталіна пролетарыят у саюзе з бяднейшым сялянствам зрабіў другі этап рэволюцыі — рэволюцыю соцыялістычную.

Скінуўшы ўладу буржуазіі, пролетарыят у саюзе з працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, падавіўшы супраціўленне эксплаататараў, адбіўшы напады інтэрвентаў, ліквідаваў капіталістычныя класы і пабудаваў у нашай краіне соцыялістычную дзяржаву рабочых і сялян.

У ПРЫФРАНТОВАЙ АБСТАНОЎЦЫ

Зімою 1916—17 года Менск—прыфрантовы губернскі горад—жыў напружана і трывожна. Усё бліжэй падыходзіў фронт. У нарастаючым страху перад ім фабрыканты спешна распрадавалі або вывозілі і тыя нешматлікія прадпрыемствы, якія меў горад. Нават дробныя камерсанты Рохлін і Дорскі, меўшыя на месцы цяперашняга завода імя Варашылава маленькі саматужны ліцейны заводзік, распрадалі ўсё і знікалі. Поўным ходам працавалі толькі менскія гарбарні. Мясцовыя ганцляры і панаехаўшыя спекулянты нажывалі мільёны на ваенных пастаўках.

Горад жыў вайной. Узрастала дарагавізна. Змяняліся ваенныя часці. Вылашчаныя афіцэры шпацыравалі па вуліцах, б'ючы сустрэчных салдат, не аддаваўшых чэсці. Бясконцыя эшалоны адпраўляліся са станцыі на Захад. Людзей гналі на фронт—у акопы. Адтуль паязды звазрачваліся з параненымі. Салдаты ў парваных шынелях, заплямленых крывёй і акопным брудам, прывозілі з сабой настроі фронта. Часней чуліся гутаркі аб бязмэтнасці лютай бойні, запеянай крывавым самадзяржаўем і капіталістамі.

— Досыць вайны! Напярпеліся...—гаварылі прыезджыя франтавікі.

У абстаноўцы напружанасці і прадчування рэвалюцыі надышлі лютаўскія падзеі.

Як і шмат іншых рабочых, я быў мабілізаваны і служыў салдатам—памочнікам шофера ў аўтакамандзе штаба 10 арміі. Аўтакаманда стаяла ў Менску. У тую памятную раніцу нас выстраілі і павялі на Саборны пляц (цяперашні пляц Волі). У горадзе адчувалася ажыўленне. Увесь пляц быў запружан салдатамі. Нас здзівіла мяккае абыходжанне афіцэраў, была відаць іх збянтэжанасць і замяшанне. У кутку пляца стаяла наспех зробленая трыбуна.

Гэта быў мітынг, на якім абвяслілі, што цара няма. Пажылы ваенны з палкоўніцкімі пагонамі заклікаў да вернасці новаму ўраду. «Немцы—нашы справечныя ворагі, і мы павінны іх перамагчы»—гаварыў ён. Салдаты маўчалі. Але калі выступіў малады мужчына ў цывільнай вопратцы, маўчанне парушылася, пачуўся гул абурэння.

— Цара скінулі, але гэта яшчэ не ўсё. Сказаўшы «а», мы павінны сказаць і «б»...

Цывільны гаварыў крыху замыславатымі сказамі, але сэнс іх быў зразумелы, ён акампанаваў агульнаму настрою салдат.

Армія—апора самадзяржаўя — пахіснулася. У пятліцах шынеляў з'явіліся чырвоныя істужкі. У казармах часта можна было знайсці нумары большэвіцкіх газет. Афіцэры ўжо не маглі стрымаць росту класавай самасвядомасці салдат.

Прамоўцы, агітаваўшыя за вайну да пераможнага канца, не раз выганяліся салдатамі з мітынгаў. Помніцца такі эпізод. Мы з шоферам павезлі на фронт двух прадстаўнікоў з Петраграда, самавітых, моцна апранутых асоб, як потым аказалася, меншавікоў. Сабралі палкавы мітынг. Першага прамоўцу салдаты мужкліва выслухалі. Другі загаварыў на тую-ж тэму—аб вайне да поўнай перамогі, аб неабходнасці адзінства народу, аб доблесці рускага войска. Гэта канчаткова абурыла салдат. Прамоўцаў сцягнулі з трыбуны, выштурхнулі з мітынга і нават не далі нам адвезці іх назад.

— Замест таго, каб вазіць усякую дрэнь,—сказаў нам старшыня салдацкага камітэта,—вы лепш навазіце нам вады для кухань.

У Менску ўсё больш разгортвалі работу большэвікі. У часе выбараў дэпутатаў у гарадскую думу, не гледзячы на адсутнасць сродкаў для агітацыі, большэвікі правялі 11 чалавек. Вялікай папулярнасцю карыстаўся адзін з кіраўнікоў большэвіцкай арганізацыі на Беларусі тав. Мяснікоў Рабочыя і салдаты ўпэўніліся, што лютаўская рэвалюцыя не змяніла становішча: буржуазія, захапіўшая ўладу, праводзіла тую-ж самую царскую палітыку. Словам абаронцаў новага ўрада больш не верылі.

З Петраграда даносіліся водгукі рэвалюцыйных выступленняў. Набліжаўся вялікі Кастрычнік. Да яго рыхтавалі сілы і большэвікі Беларусі.

І. ЛІСОЎСКІ.

Дырэктар завода імя Варашылава.

ДАКУМЕНТЫ

ЗАЯВА КАМАНДЫ ПАЛКАВЫХ САПЁРАЎ

стралкоў 63 пяхотнага Сібірскага палка Канстанціна Бачарова і Пятра Ефімава

У СОВЕТ РАБОЧЫХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ

Гэтым маю гонар давесці да ведама Совета Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, што афіцэрства вышэйпамянёнага 63 пях. Сібірскага стралковага палка, на чале з камандзірам палка, палкоўнікам Севанам, зусім не жадае прызнаваць цяпер устанавіўшыйся парадак у Расіі на чале з Часовым урадам, а ўсяляк стараецца трымаць нас усіх ранейшага парадку. Учора, напрыклад, (13 сакавіка) памянёны камандзір, выстраіўшы роты, прачытаў у скамечаным відзе загад ваеннага міністра за № 114, дараваўшы пэўныя грамадзянскія правы нам, салдатам, растлумачыўшы, што свабода, моў, дана толькі хля жыдоў, што жыды сядуць цяпер вам на шыю, да стаяўшага ў радах таварыша яўрэя падышоў і, указваючы пальцам—«вось ён, жыд», з пытаннем: «ну што, жыдоўская морда, атрымаў сваботу», калі таварыш яўрэй адказаў «так точна пан палкоўнік», пасля чаго палкоўнік Севанаў уляпіў некалькі аплявух таварышу салдату яўрэю і загадаў яго паставіць над ружжо на 4 гадзіны. Да нас-жа ўсіх ён звярнуўся што, моў, сваботу вам даў Гучкоў, Мілюкоў і т. д., што вы можаце ездзіць у трамваі, хадзіць у тэатр, гэта для васжа няважна, лепш яны далі-б вам хлеба, прыбавілі-б пэнсіі і т. д.

Мы кроўю заслужылі наша найменаванне ваша высокаблагародзіе, благародзіе і т. д. І каб які-небудзь мярзавец мог-бы мне сказаць проста п. палкоўнік або, каб я да яго звярнуўся на вы, гэтаму не быць. Сёння 14 сакавіка, наш полк прыводзіцца да прысягі, прычым нам даюць падпісаць на зусім белым (чыстым) аркушу паперы, калі-ж некаторыя з нашых таварышоў запыталі, чаму белы аркуш, чаму няма тэкста новай прысягі, ён адказаў, што трэба будзе потым упісаць. Потым, па дайшоўшых да нас вестках, нас хацелі зусім абязброіць, загадаўшы здаць усе вінтоўкі, але мы не згадзіліся і вінтоўкі ў нас. У кулямётнай-жа каманды, якая знаходзіцца ад палка асобна (у 3—4 вярстах), адабраны ўсе кулямёты і такавыя пастаўлены на плошчы, дзе прадпалагаецца быць прысязе. Пры гэтым даладзім, што ад усіх салдат палка ўсяляк стараюцца ўтаіць цяперашняе становішча, адбіраюць якія-б там ні было газеты, падвяргаючы пакаранню за прачытанне газет, лісткоў і т. д. Потым ва ўсіх ротах прымушаюць і па сёння спяваць гімн «божа цара храні».

Наколькі нам вядома, памянёныя факты, жаданне п. п. афіцэраў прывіць нам ўсякімі праўдамі і няпраўдамі прыверженства да ранейшага ладу і патрабаванне сілай звароту яго праводзіцца ва ўсёй нашай (16 Сібірскай стралковай нова фармуемай) дывізіі, начальнікам дывізіі якой састаіць генерал Бунін, ад якога і зыходзяць памянёныя дырэктывы.

Просім аб прыняцці хуткіх мер.

14 сакавіка 1917 года.

Канстанцін БАЧАРОЎ, Пётр ЕФІМАЎ.

У дапаўненне да заявы 63 пях. стр. Сібірскага палка, генерал Бунін, начальнік 16 Сібірскай стралковай дывізіі нова фармуемай, заяўляе, што новаму ўраду вэрыць нельга і не выконвае ніякіх загадаў, зыходзячых ад новага ўрада, прымушае спяваць стары гімн і дзейнічае падаўляюча са зброяй у руках, не дапускае чытання газет. Усе афіцэры памянёнай дывізіі ідуць сумесна з генералам Буніным.

Заява 4 понтоннага батальёна Рагачоўскага.

14 сакавіка 1917 года.

ТЭЛЕГРАМА ПОНАШТАВЕРХ

10/III 1917 года

Менск 10 сакавіка, 15 гадз. 45 мін. Апошнімі падзеямі і распараджэннямі ўрада армія далучана да палітычнага жыцця, прычым некаторыя палітычныя плыні робяць усе намаганні ўзяць у рукі выключнае кіраўніцтва салдатам, у чым маюць вялікі поспех. Афіцэрскае-ж асяродзе, выхаванае на пачатках арт. 100 статута ўнутранай службы, асталося ў сваёй масе інертным і аказалася ў баку ад руху, чым пягаціцца больш актыўная частка яго, адчуваючая, што салдат ад яе ўходзіць. Раз пранікненне палітыкі ў армію не можа быць опынена, то неабходна, каб афіцэрства ўзялося за самаарганізацыю, каб мець адпаведнае значэнне ў гэтым новым баку жыцця арміі ў гэтых мэтах на 11 сакавіка назначан агульны сход афіцэраў Менскага гарнізона, але зусім неабходна ўнікнуць таго, каб такія сходы афіцэраў узбудзілі недавер'е салдат і маглі быць вытлумачаны ў тым сэнсе, што афіцэры абасабліваюцца ад салдат у нейкіх патаемных мэтах, таму з'яўляецца патрэбным на гэтыя афіцэрскія сходы дапускаць прысутнасць прадстаўнікоў ад салдат і грамадскіх палітычных арганізацый, прымаючы вышэйпаданыя меры неабходнымі, але не жадаючы прадвырашаць такога пытання ў сувязі з тэлеграмай Наштаверху пр.

6463 Галоўказан загадаў прасіць спешнага ўказання 6483.

КВЯЦІНСКІ.

ДАНЯСЕННЕ

У камітэт салдацкіх і рабочых дэпутатаў

Салдат 167 транспарта, 34 дадатковага абознага батальёна ваеннага часу

Маем гонар гэтым данясці да ведама Камітэта Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў аб тым, што адбываецца ў нашай часці.

У нас стары рэжым, які выражаецца ў наступным:

1) да гэтага часу камандзірам нашым патрабуецца прысвоенае ім яшчэ раней «тытулаванне» «ваша высокаблагароддзе», ён у чыне штабс-капітана;

2) пры рапарце ў варты ля грашовай скрыні па-ранейшаму ўпамінаецца «яго вялікасць» па настойліваму патрабаванню камандзіра;

3) загады, атрыманыя ўжо больш 2 тыдняў, з іменна: «Акты адрачэння», загад № 114 і інш. затрымліваюцца і не абвяшчаюцца;

4) адносіны камандзіра да ноўшастваў недаверлівыя і варожыя;

5) яднанне салдат праследуецца і

6) падшуканы камандзірам асобы, якім даручана сачыць, перашкаджаць і даносіць аб усім, што будзе сказана паміж падначаленымі яго.

У сувязі з тым, што яўным прыхільнікам старога парадку ў асобе камандзіра і справавода ўдаецца сеяць варожасць паміж салдатамі, просім прыйсці нам на дапамогу, прыслаўшы сваіх дэпутатаў для расследвання і прыняцця мер да падаўлення старога парадку, аж да адрашэння ад пасады прыхільнікаў яго.

Салдаты (рад подпісаў)

19 сакавіка 1917 г.

Старшыня схода салдат С. Алексеєў.

Сакратар Пратавік. Члены: В. Фёдараў, І. Ціт...

Прысягі не было, загады не чытаны, дэлегаты прыехалі без водпуску і ім пагражае цяжкае пакаранне.

На мадрыдскім фронце. НА ЗДЫМКУ: байцы ўрадавых войск за абедам.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 11 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе: У раёне Гвадалахары (на паўночны ўсход ад Мадрыда) мяцежнікі пралаўжаюць аказваць націск на пазіцыі рэспубліканцаў. Урадавыя войскі стрымалі іх наступленне і перайшлі ў контратаку, прычыніўшы мяцежнікам велізарныя страты.

Да мяцежнікаў, якія дзейнічаюць на фронце Овіедо (галоўны горад Астурыі), падышлі падмацаванні. Прыбыўшыя часці мяцежнікаў жорстка атакавалі пазіцыі рэспубліканцаў у Буэнавіста. У рэзультаце бою мяцежнікі былі вымушаны адступіць і панеслі сур'ёзныя страты. Тры атрады мяцежнікаў імкнуліся пранікнуць у Овіедо. Адзін атрад колькасцю ў 50 салдат, нечакана падышоўшы да лініі ўрадавых войск, быў амаль поўнасцю знішчан. Другі атрад нечакана прабраўся ў размяшчанне камандавання рэспубліканскага батальёна імя Матэоці. Рэспубліканцы ўзялі ў палон каманзіра і прымусілі атрад мяцежнікаў адступіць. Трэці атрад быў таксама затрыман рэспубліканцамі.

Растуць сімпатыі працоўных Германіі да іспанскага народу

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 10 сакавіка. (БЕЛТА). Орган радыкал-сацыялістаў «Эўр», падкрэсліваючы імкненне германскага фашызма паскорыць развіццё падзей у Іспаніі, адзначае разам з тым рост сімпатый германскіх працоўных да рэспубліканскай Іспаніі. Гэта выражаецца, у прыватнасці, у павелічэнні грашовых збораў на карысць іспанскага народу. Паводле слоў газеты, у апошнія 5 месяцаў у Германіі арыштавана 3 тысячы працоўных за праяўленне сімпатый да іспанскага народу.

РАШЭННЕ II І АМСТЭРДАМСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛАЎ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 11 сакавіка. (БЕЛТА). Згодна атрыманых вестак, на аб'яднаным пасяджэнні сакратарыятаў II і Амстэрдамскага інтэрнацыяналаў вырашана не дапусціць прадстаўнікоў Комінтэрна на канферэнцыю па пытанню аб дапамозе рэспубліканскай Іспаніі, скліканую ў Лондане.

НОВЫ ФІНЛЯНДСКІ ПРЭМ'ЕР

ГЕЛЬСІНГФОРС (сталіца Фінляндыі), 11 сакавіка. (БЕЛТА). Учора прэзідэнт рэспублікі Кэлё даручыў аднаму з лідэраў прагрэсіўнай партыі прафесару Каяндэру стварэнне новага ўрада.

Каяндэр — быў прэм'ер у 1922 і 1924 г. г. Ён займаў таксама пост ваеннага міністра ў 1928—1929 г. г.

ПА ЗАКАЗУ З БЕРЛІНА

Тры гады назад, у 1934 годзе, германскія фашысты падрыхтавалі ўзброенае выступленне сваіх стаўленікаў у Аўстрыі ў мэтах звяржэння ўрада Дольфуса і ўстанаўлення фашысцкай дыктатуры гітлераўскага тыпу.

Путч сарваўся. Гітлераўскім малайцам удалося толькі забіць главу ўрада Дольфуса.

Такі-ж путч падрыхтоўвалі агенты Гестапо і знешнэ-палітычнага аддзела нацыянал-сацыялісцкай партыі Германіі і ў Венгрыі.

Нядаўна венгерскія ўлады выкрылі змову многіх афіцэраў супроць урада Даран'і. Саюз афіцэраў запаса «МОВА», пасля звязаны з арганізацыяй фашысцкіх студэнтаў і з партыяй венгерскіх гітлераўцаў, рыхтаваў ваенны паход на Будапешт (сталіцу Венгрыі) у мэтах звяржэння ўрада і ўстанаўлення гітлераўскай дыктатуры.

Як выявілася, германскі пасланнік у Венгрыі Макензен і германскі ваенны аташэ ведалі аб гэтай змове. Путчысты атрымалі з Германіі грошы і прапагандысцкую літаратуру, якая дастаўлялася ім дыпламатычнай поштай.

Па справе аб путчы арыштавана звыш 100 афіцэраў венгерскай арміі і рад іншых асоб.

Падрыхтоўка путча з'яўляецца часткай плана германскіх фашыстаў па ажыццяўленню свайго панавання ў паўднёва-ўсходняй Еўропе, па пранікненню ў раён Дунайскага басейна і на Балканы.

Гітлерыцаўская Венгрыі павінна была адыграць вялікую ролю ў справе зрыву калектыўнай безапасныасці і акружэння Чэхаславакіі.

30 студзеня ў сваёй прамове ў рэйхстагу, у сувязі з 4-годзем фашысцкай дыктатуры, Гітлер прылічыў Венгрыю да ліку «прыяцельскіх» дзяржаў. За мавой завесай запэўненняў у «дружбе» гітлераўцы распрацоўвалі план дзяржаўнага перавароту і звяржэння ўрада. «Добрая берлінская бабушка» венгерскай «Чырвонай шапачкі» аказалася лютым фашысцкім воўкам.

Вераломства і здрадніцтва сталі ўлюбёнымі метадамі германскай знешняй палітыкі.

ПОДЛЫЯ ДЗЕЯННІ ЗГРАІ ДВУРУШНІКАЎ

(З ЗАЛЫ СУДА)

ЛЕПЕЛЬ. (Па тэлефону ад спец. кар. «Звязды»). На допыце Семашка — адзін з цэнтральных фігур працэса, галоўны арганізатар і натхніцель абураючых скаржэнняў палітыкі партыі і совецкай улады ў вёсцы. Ён быў настойлівы, гэты Семашка, настойлівы, калі гутарка ішла аб гэтым адміністраванні.

Масавая работа? Не, гэта не ўваходзіла ў планы Семашка. Ён прызнаваў толькі адзіны сродак: «прыняць меры», а прыняць меры азначала — аштрафаваць, апісаць і забраць маемасць.

Калі старшыні якога-небудзь сельсовета было цяжка справіцца самому, Семашка выязджаў на месца і асабіста кіраваў расправай з нядоімшчыкамі.

Да скаргаў працоўных Семашка адносіўся гаксама па-напляваецельску, як Русанов. Скаргі месяцамі і гадамі ляжалі, марнаваліся ў райвыканкоме.

Як старшыня райвыканкома, Семашка адначасова з'яўляўся і старшынёй раённай палатковай камісіі. Але гэта «камісія» ніколі не збіралася. Не разглядаліся заявы працоўных на няправільнае абкладанне.

Семашка прызнае сябе віноўным прад'яўленых абвінавачваннях. І калі в папярэднім следстве ён алмаўляў свае паінфармаванасць аб масавых вобысках, то на судзе, выкрыты шматлікімі фактамі, ён зразумеў, што адмаўленнем іх ён паставіў-бы сябе ў смешнае становішча. Яму асталося толькі поўнасцю пацвердзіць прад'яўленыя абвінавачванні.

Прызналі сабе віноўнымі і дапытаныя на тым-жа пасяджэнні 10 сакавіка былы сакратары РК КП(б)Б Папэнгель і Юшкевіч. Пры іх допыце выявілася агідная атмасфера чванства і бюракратызма, якая панавала ў кіраўніцтве раённай партыйнай арганізацыі.

Папэнгель зусім не цікавіўся жыццём раёна. Большасць свайго часу ён праводзіў у доме адначынку. Рабочы дзень першага сакратара райкома працягваўся некалькі гадзін, якія праходзілі на клопатах аб... падшыўцы ў папку пратаколаў бюро райкома.

Калі Семашка прыходзіў узгадняць свае ўстаноўкі, Папэнгель не задумваючыся санкцыянаваў іх, бо яны якраз адпавядалі яго ўласным думкам і перакананням. А калі ўсё-ж праз шчыліны зачыненых дзвераў да Папэнгеля даходзілі сігналы аб агідных перагібах у сельсоветах, гэта яго нікольки не турбавала:

— Гэта не наша партыйная справа, гэта справа Семашка.

Даступіцца да сакратара райкома і маглі не толькі радавыя партыйцы, а нават і партыйны актыў. Многія парторгі і старшыні сельсоветаў так і не мелі шчасця бачыць Папэнгеля і не бедаваць свайго раённага кіраўніка. Што ўжо казаць аб беспартыйных. Іх сустракалі ў райкоме холадна і суха.

— Вы беспартыйны? Ідзіце ў раённы выканком. Таварыш Папэнгель не змог вас прыняць.

Так, адгарадзіўшыся жалезнай сцяной ад прапоўных мас, замкнуўшыся ў сваёй уласную шкарлупу, кіраўнікі лепельскай партарганізацыі ператварыліся ў заклятых чыноўнікаў і бюракратаў, канчаткова страцілі твар палітычных работнікаў.

Юшкевіч быў другім сакратаром райкома. Ён прызнае сваю віну. Але ў той-ж час мабілізуе розныя аргументы, каб зняць з сябе адказнасць за тое, што адбывалася ў раёне.

Ён не выступіў супроць парушальнікаў совецкіх законаў, не выкрыў усе іх абуючыя дзеянні, а, наадварот, сам ухіліўся за гэтыя брудныя антысовецкія метады «выканання ільнозагатовак».

* * *

ЛЕПЕЛЬ. Усё дзённае і вячэрняе пасяджэнні 11 сакавіка былі прысвечаны допыту сведак. Перад судом прайшлі звыш 20 сведак. Зноў з яшчэ большай паўнатой высвятляецца доўгі ланцуг злачынстваў, зробленых Семашка, Папэнгелем, Гайсёнкам і інш. падсудныя. Выяўляецца яшчэ адзін прыклад абвінавачваемага. Гайсёнак, прыходзячы да нядоімшчыкаў з вобыскамі, не толькі дапускаў грубую лаянку, але і прымяняў фізічны гвалт. Сведка Малашко Мазго расказвае, як Гайсёнак штурхнуў яе кулаком у грудзі, калі яна падышла прасіць не забіраць яе рэчаў. Тое самае паказала Мазго Тэкля, якую Гайсёнак таксама ўдарыў кулаком.

Пры адабранні маемасці Гайсёнак і лічыў патрэбным пакідаць коню вошай. Ніякіх дакументаў у нядоімшчыкаў ён не пакідалася.

Сведка Міхно Іван расказаў суду, як Гайсёнак узяў у яго 100 руб. штрафу, не выдаў ніякіх дакументаў, а потым заявіў, што грошы не браў. Гэты факт пацвердзіла Міхно Насця.

Сведкі Хацько, Шатыронак, Дземка і інш. пацвярджаюць, што Семашка дае установку аб арганізацыі масавых вобыскаў пад выглядам санітарных, пропускарных абходаў.

Сведка Шавалда расказвае аб тым, як былы загадчык райфа Русанов зламаў у яе шкаф. Забраў адтуль грошы, не палічыўшы нават, і панёс іх у сельсовет. Па словах сведкі, там было 900 руб. Русановіч аформіў толькі 800.

Так канчаткова разлажыўшыяся кіраўнікі раёна не толькі парушалі палаткову палітыку, але і займаліся простым жульніцтвам.

С. ГАЛКІН.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

БДТ-1 — Ваўкі і авечкі. (Абанемент № 5). «Чырвоная зорка» — Дарыко. «Пролетарый» — Апошняя ноч. «Інтэрнацыянал» — Юнацтва Максіма. «Спартак» — Дзяўчына спяшаецца на спатканне. Дзіцячы кінотэатр — Сапраўдны таварыш.

Лекторый пры Цэнтральным доме техніка (Комсамольская, 25). Сёння ў 7 г. 30 м. вечара — лекцыя на тэму: «Будова і развіццё сонца». Чытае лектар Маскоўскага планетарыя тав. Палякоў.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 12 І 13 САКАВІКА

8.30 — тэкст даклада т. Жданава на пленуме ЦК ВКП(б) на яўрэйскай мове. 15 — гутарка аб лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. 16 — мантаж п'есы Якуба Коласа «Вайна вайне». 17 — дзіцячая перадача. 18.30 — завочная партвучоба. 20 — гутарка «Першы З'езд РСДРП у Менску». 20.15 — канцэрт. 20.45 — літаратурная перадача на польскай мове. 21.15 — п'еса «Сон» Тараса Шэўчэнка, пераклад на беларускай мове Янкі Купалы. 22 — сімфанічны канцэрт. 23 — «Апошнія паведамленні». 23.15 — тэкст даклада т. Жданава на пленуме ЦК ВКП(б) на польскай мове.

Даклад тав. Жданава на беларускай мове будзе перадавацца 12 у 8 г. раніцы.

А. ЗЮЗЬКОЎ

ЛЮТАЎСКАЯ БУРЖУАЗНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РЭВОЛЮЦЫЯ

У Беларусь паведамленне аб рэвалюцыі ў Петраградзе прыйшло з вялікай затрымкай. Стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілеве і камандаванне Заходнім фронтам у Менску, баючыся выступлення шматмільённай масы салдат, сканцэнтраванай на франтах, затрымлівалі весткі аб рэвалюцыі ў сталіцы.

Неабходна мець на ўвазе, што ў гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі знаходзіўся Заходні фронт. На невялікай параўнальна адлегласці было сканцэнтравана каля 2 мільёнаў узброеных салдат. Выступленняў вось гэтай-та салдацкай масы і баялася камандаванне фронтам. Нават 17 (4) сакавіка, калі ў Петраградзе рэвалюцыя ўжо таржаствавала перамогу, у газеце «Минский голос» было змешчана паведамленне Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага аб тым, што неабходна вылаўліваць едучых з Петраграда «агітатараў».

Але група прапуючых у Менску большэвікоў ужо вела аб пазеях, якія адбываліся ў сталіцы, і ўзначаліла пераварот у Менску.

Гэта група, складаўшаяся з раду буйнейшых большэвікоў, як т. Фрунзе (у падполлі працаваў па прозвішчу «Міхайлаў»), Кнорын Любімаў і інш., яшчэ да рэвалюцыі знаходзячыся ў падполлі, праводзіла велізарную работу па арганізацыі рабочых мас Менска і салдат Заходняга фронта. У вялікай колькасці на працягу 1915 і 1916 гадоў былі распаўсюджаны лістоўкі з большэвіцкімі лозунгамі супроць вайны, праводзіліся сходы і гутаркі з салдатамі. Апрача непасрэднай работы гэтай групы большэвікоў сюды-ж у Менск і на Заходні фронт прыязджалі рад таварышоў ад Маскоўскага і Петраградскага камітэтаў (т. Розенгольц і іншыя).

Большэвіцкая арганізацыя да рэвалюцыі існавала таксама і ў Гомелі. Работай менскай і гомельскай арганізацый і тлумачыцца цэлы рад салдацкіх паўстанняў, пракацёўшыхся па гарадах Беларусі ў канцы 1916 і ў пачатку 1917 гадоў (паўстанні ў Гомелі, у Менску і т. д.). Гэта-ж работа большэвікоў падрыхтавала і тыя поспехі, якія атрымалі рабочыя і салдаты ў Беларусі ў першыя-ж дні рэвалюцыі.

Ужо 15 (2) сакавіка група менскіх большэвікоў паведаміла рабочых буйнейшых прадпрыемстваў Менска аб адбыўшайся рэвалюцыі ў Петраградзе. Большэвікі сумесна з рабочымі электрастанцыі і чыгуначных майстэрняў днём 15 (2) сакавіка раззброілі паліцыю, а ўвечары рабочыя Менска дэманстравалі па гораду. І калі к пачатку дня к рабочай дэманстрацыі прымыкалі толькі асобныя салдаты, то к канцу дня ўжо адбываліся масавыя братанні рабочых і салдат.

У Гомелі 16 (3) сакавіка пачаліся ўжо выбары ў Совет Рабочых Дэпутатаў. 17 (4) сакавіка ў Менску адбыўся сход большэвікоў з прыцягненнем прадстаўнікоў ад рабочых раду буйнейшых прадпрыемстваў па пытанню аб арганізацыі Менскага Совета Рабочых Дэпутатаў. Быў выбран часовы Выканаўчы Камітэт, якому даручана арганізаваць Совет Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў. У першыя-ж дні рэвалюцыі Советы Рабочых Дэпутатаў стварыліся ў Віцебску, Бабруйску, Оршы, Барысаве, Полацку і іншых гарадах Беларусі. Амаль адначасова арганізоўваліся і Советы Салдацкіх Дэпутатаў, якія паўсямесна ў сярэдзіне сакавіка зліліся з Советамі Рабочых Дэпутатаў.

Вельмі характэрна, што Советы Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў і, у першую чаргу Менскі Совет, адразу становіцца на чале шырокай арганізацыі мас. Ужо на пасяджанні Менскага Совета Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў 21 (8) сакавіка было пастаноўлена арганізаваць у ваенных часцях салдацкія камітэты, на фабрыках і заводах — фабрычна-заводскія камітэты і прафесіянальныя саюзы, па вёсках і валасцях —сельскія валасныя і павятовыя сялянскія камітэты. Тым самым Менскі Совет, на чале якога знаходзіліся большэвікі (старшыня Совета тав. Позерн, яго намеснік тав. Любімаў), станавіўся на чале арганізацыі рабочых, салдацкіх і сялянскіх мас Беларусі і Заходняга фронта.

Афармляюцца большэвіцкія арганізацыі. Першай, аформіўшайся як самастойная большэвіцкая арганізацыя, была арганізацыя ў Гомелі. Пасля прыезду тав. Хатаевіча з ссылкі адразу-ж было пастаўлена пытанне аб афармленні арганізацыі большэвікоў ў Гомелі. На сходзе пры выбарах камітэта 19 (6) красавіка гомельская арганізацыя большэвікоў налічвала ўсяго 30 таварышоў. Але гэта невялікая група, стварыўшая сваю самастойную арганізацыю, ужо да 1 мая (18 красавіка) звязалася з рабочымі гомельскіх прадпрыемстваў, вырасла да 200 чалавек. Была ўтворана большэвіцкая фракцыя ў гомельскім Совеце ў колькасці 30 таварышоў.

Пад большэвіцкімі спягамі 1 Мая па Гомелю дэманстравала велізарнейшая калона колькасцю звыш 5.000 чалавек. Такім чынам гомельскія большэвікі, стварыўшы сваю самастойную большэвіцкую арганізацыю, хутка заваёўваюць масы і, кіруючыся з сярэдзіны 1917 года т. Кагановічам Л. М., упісалі не адну слаўную старонку ў гісторыю рэвалюцыйнага руху ў Беларусі ў 1917 годзе.

Менскія большэвікі не стварылі сваёй самастойнай арганізацыі і ўвайшлі ў аб'яднаную сумесна з меншавікамі і бундаўцамі арганізацыю РСДРП. Гэтым уваходам была зроблена буйнейшая трацкісцка-аб'яднаўчая памылка.

У першым-жа пісьме ў Расію, пасля атрымання весткі аб рэвалюцыі, Уладзімір Ільіч папярэджваў супроць падобнага роду памылак: «Найвялікшым няшчасцем было-бы..., калі-бы нашы пайшлі на адзінства з Чхеідзе і К°..» «Па-мойму, галоўнае цяпер — не даць запалохаць сябе ў глупыя «аб'яднальныя» спробы з сацыял-патрыётамі (ці, яшчэ небяспечней, хістаючымися, накшталт арганізацыйнага камітэта Троцкага і К°) і працягваць работу сваёй партыі ў паслядоўна-інтэрнацыянальным духу»*).

Стварэнне самастойнай большэвіцкай арганізацыі ў Менску зацягнулася да канца мая. Праўда, група большэвікоў (тт. Фрунзе, Кнорын, Любімаў), нязгодныя з уваходам у «аб'яднанку», увесь час вялі самастойную работу ў менскім Совеце і падрыхтоўвалі стварэнне самастойнай большэвіцкай арганізацыі. Рашаючае значэнне для разрыву «аб'яднанкі» і стварэння самастойнай большэвіцкай арганізацыі ў Менску сыгралі ленінскія красавіцкія тэзісы і рашэнні VII красавіцкай канферэнцыі большэвікоў. Тав. Мяснікоў, пасланы Цэнтральным Камітэтам партыі большэвікоў у Менск у красавіку месяцы для работы, дапамог указанай вышэй групе большэвікоў аформіць самастойную большэвіцкую арганізацыю.

Перад большэвікамі ў Беларусі, таксама як і перад партыяй большэвікоў усёй Расіі адразу-ж пасля буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ўсталі грандыёзныя залачы па адваяванню рабочых і салдацкіх мас ад дробнабуржуазных, контррэвалюцыйных партый (эсэраў, меншавікоў, бундаўцаў, Беларускай сацыялістычнай грамады).

Большэвікі праводзілі велізарную выкрываўчую работу як дробнабуржуазных партый, так і контррэвалюцыйнай дзейнасці рознастайных беларускіх нацыяналістычных арганізацый, якія ўзначальваліся Беларускай сацыялістычнай грамадой. Апошняя на сваёй канферэнцыі 7 красавіка (25 сакавіка) 1917 года выказалася за падтрыманне часовага ўрада і за працяг вайны да пераможнага канца: «Канферэнцыя БСГ лічыць вайну ў сучасны момант вайной рэвалюцыйнай Расіі з германскім мілітарызмам, маючай мэту абараніць здабытую вялікай рэвалюцыяй свабоду ад замаху звонку».

Канферэнцыя БСГ выступала супроць захвату сялянамі памешчыцкіх зямель.

Бундаўцы, таксама як і меншавікі, у першыя-ж дні рэвалюцыі выказаліся за падтрыманне Часовага Урада і за працяг вайны. Ва ўвесь перыяд 1917 года бундаўцы з'яўляліся штрэйкбрэхерамі ўсіх забастовак, правадзімых пад кіраўніцтвам большэвікоў. Бундаўцы дзейнічалі таксама, як і Беларуская сацыялістычная грамада, якая зрывала сялянскія выступленні.

Паслядоўна, крок за крокам выкрываючы контррэвалюцыйныя дробнабуржуазныя партыі, большэвікі арганізавалі масы і вялі іх к пролетарскай сацыялістычнай рэвалюцыі.

*) Ленін, Том XX, стар. 5-я і 7-я.

Уп. Галоўлітбела № К—588. Друкарня газеты «Звязда». Менск, Совецкая, 63. К., К. С.